*Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!*

# Работніца і Калгасніца БЕЛАРУСІ

№ 18

1934 г.



На здымку: 1-я жаночая сталінская брыгада паказальнага поезда № 89—90 Менскага вузла (Матар'ял гл. на стар. 3)

# Пабедны марш непераможнай Чырвонай арміі нашай вялікай радзімы

**Сустрэча наркома абароны—т. Варашылава і парад, арганізаваны ў яго гонар—яркі выраз адданасці і бязмежнага давер'я працоўных мас да сваёй партыі, яе ЦК і вялікаму Сталіну.**

Неперадаваемая радасць, энтузіязм гонар мас тым, што яны мелі права рапартаваць члену палітбюро, лепшаму саратніку вялікага Сталіна—жалезнаму наркому абароны Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву аб тым, што Беларусь датэрмінова выканала план хлебапаставак.

10-га верасня, тры гадзіны дня. Калоны працоўных усё больш і больш набліжаюцца да трыбуны. Войска пастроена для парада. Магутнае „ура" ляціць насустрач наркому абароны.

У суправаджэнні тав. Будзённага і камандуючага Беларускай ваеннай акругі тав. Убарэвіча, т. Варашылаў аб'язджае ваенныя часці і калоны працоўных горада Менска. Пасля чаго ён пад'язджае да месца пленума і хутка ўзыходзіць на трыбуну.

Разам з тав. Варашылавым на трыбуну ўзыходзяць т. т. Гікало, Убарэвіч, Валковіч, Галадзед, Смірноў, Эйдэман, Закоўскі, Будзённы, Бэнек, Кавальчук, Рыскін, Конік, Горын, Чэрнушэвіч і іншыя.

— Я вельмі ганаруся тым, што маю магчымасць перадаць ад імя ЦК КП(б)Б, урада БССР і ўсіх працоўных Беларусі большэвіцкае прывітанне нашай слаўнай Чырвонай арміі і любімаму наркому Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву — разносяцца кінутыя ў мікрафон словы старшыні СНК БССР тав. Галадзеда.

З прывітаннем ад імя рабочай пралетарскай сталіцы выступіў рабочы машынабудаўнічага завода імя Варашылава тав. Мінковіч. Ён прасіў тав. Варашылава запэўніць ЦК ВКП(б) і асабліва тав. Сталіна ў тым, што працоўныя Менска, як і ўсёй Беларусі, будуць і ў далейшым, не шкадуючы сіл і энергіі, змагацца за ажыццяўленне задач соцыялістычнага будаўніцтва, за далейшае ўмацаванне абараназдольнасці краіны. З прывітаннем ад калгаснікаў БССР выступіў тав. Карнейчык, ад піонераў тав. Бурштэйн.

Ля мікрафона тав. Варашылаў. Доўга несмаўкаемыя воплескі і крыкі „ура" не даюць яму гаварыць. Нарэшце ўсе сціхлі.

— Таварышы калгаснікі і калгасніцы, рабочыя і работніцы, комсамольцы і піонерыя, чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, я рад вітаць вас ад імя ЦК ВКП(б) і Савецкага Саюза.

— Рабоча-сялянская Чырвоная армія цяпер праводзіць праверку сваёй баявой падрыхтоўкі. Войскі Беларускай ваеннай акругі на практычных занятках, якія зараз закончыліся, паказалі добрыя рэзультаты.

Нашы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, разам з працоўнымі Савецкай Беларусі, дабіліся вялікіх поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. У часе заняткаў яны яшчэ раз пераканаліся, з якім энтузіязмам і энергіяй калгаснікі і рабочыя Беларусі змагаліся за тое, каб не адстаць ад Чырвонай арміі ў выкананні стаячых перад імі задач. І гэта зразумела. Мы разуменне армія не аддзяляем ад разумення народ. Мы—адзіны цэлы калектыў, які паставіў перад сабой сусветную задачу—пабудову соцыялізма і за ажыццяўленне гэтай задачы змагацца.

— Гэта задача складаная і цяжкая, але мы яе вырашым!

— Таварышы працоўныя БССР, я буду шчаслівы перадаць ЦК ВКП(б) і ўраду Саюза, перадаць тав. Сталіну, што вы не толькі абяцаеце працаваць па-большэвіцку, але і змагаецеся за тое, каб гэтае абяцанне на справе выканаць.

Няхай жыве наш вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жывуць пралетарыі нашай краіны, нашы калгаснікі і ўсе працоўныя!

Няхай жыве наша Чырвоная армія!

Няхай жыве наша магутная комуністычная партыя і яе мудры, вялікі правадыр таварыш Сталін

Апошнія словы тав. Варашылава тонуць у магутных крыках „ура".

Стройнымі калонамі, шэраг за шэрагам, жалезным поступам праходзяць каля ўрадавай трыбуны, упэўненыя ў сваёй перамозе, вялікай магутнасці Совецкага Саюза часці непераможнай Чырвонай арміі.

Парад прымае асабіста тав. Варашылаў.




На трыбуне ўрачыстага Пленума Гарсавета: т. т. Варашылаў, Будзённы, Гікало, Валковіч, Галадзед, Убарэвіч, Закоўскі, Рыскін і інш.

# Уцягнуць жанчыну ў работу совецкага кантроля

*(Артыкул упаўнаважанага Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР па БССР т. Іванова)*

**„Якім-жа іншым спосабам можна спыніць бюракратызм, як не пры цягненнем рабочых і сялян“** *(Ленін, Збор твораў, т. XVIII, ч. II, стар. 188)*

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і геніяльнага правадыра нашай партыі тав. Сталіна краіна дабілася велізарных, зусім выключных поспехаў у справе соцыялістычнага будаўніцтва. З краіны адсталай, краіны забітай, краіны тэхнічна-слабай—Совецкі Саюз стаў краінай магутнай, краінай багатай, краінай нябачанага ўздыму экономікі і культуры.

Велізарнейшым дасягненнем нашай краіны з'яўляецца тое, што уздымаючы экономіку і культуру ў краіне ў цэлым, мы ўцягваем у барацьбу за гэты ўздым на аснове роста культуры нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу—усе нацыянальнасці, якія насяляюць наш вялікі Саюз.

Нябачаным поспехам, якія дасягнуты намі, мы абавязаны таксама таму, што мы ўцягнулі ў актыўнейшую работу, як раўнапраўных удзельнікаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва—велізарную колькасць жанчын, якія да Окцябра амаль зусім не ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці і зусім недастаткова ўдзельнічалі ў вытворчасці.

У выніку мы ўжо зараз маем мільёны жанчынактывістак, якія ў радзе выпадкаў паказваюць надзвычайна добрыя ўзоры грамадскай і вытворчай работы, узоры барацьбы за соцыялізм.

Перад намі стаіць задача яшчэ ў большай ступені ўцягнуць у справу соцыялістычнага будаўніцтва жанчыну-работніцу, жонку рабочага, калгасніцу, у справу актыўнейшага ўдзелу барацьбы за ўздым не толькі вытворчага жыцця ў краіне (вялікіх поспехаў мы ўжо ў гэтым дабіліся), але і ў барацьбе за палепшанне матэрыяльна-бытавога становішча працоўных, у справу яшчэ большага, лепшага культурнага абслугоўвання працоўных.

Патрэбна дабіцца таго, каб сваім кантролем, сваёй праверкай пранікнуць ва ўсе драбнейшыя, здаецца самыя нязначныя звенні нашай работы. За той кароткі тэрмін работы, які мае ў Беларусі апарат Камісіі Совецкага Кантроля—мы выявілі рад сур'ёзных недахопаў і агіднасцей, якія не маглі-б мець месца пры ўмове штодзённай масавай праверкі самімі працоўнымі ўсіх драбнейшых звенняў нашага велізарнага совецкага, гаспадарчага і грамадскага апарата.

Намі ўскрыты сур'ёзныя недахопы ў справе хлебапячэння на Беларусі (антысанітарнае становішча хлебазаводаў, выпуск у велізарнай колькасці нестандартнага хлеба паніжанай якасці, факты псавання хлеба на Мазырскім і Менскім хлебазаводах і т. д.).

Выяўлены выпадкі абмервання, абвешвання і павышэння цэн. Устаноўлена непадрыхтаванасць рада школ Беларусі да пачатку вучэбнага года і зусім нездавальняючая работа рада школ з адстаючымі вучнямі ў летні перыяд. Выяўлена агідная работа збытавых баз Саюзшвейзбыта і Шклозбыта Беларусі. Выяўлена значная колькасць выпадкаў перагібаў у справе барацьбы за ачыстку калгасаў ад варожых элементаў, калі ў некаторых калгасах пад выглядам ачысткі калгасаў ад варожых элементаў, рабілася выключэнне і чэсных калгаснікаў. Выяўлены факты разбазарвання і няправільнага выдаткавання прадукцыі ў Саюзтабакгандлі, Менскім ГУМ'е, Саюзрыбзбыце, радзе раймагаў Белкаапсаюза і т. д.

Ускрыты барска-зняважлівыя адносіны да бытавых патрэб рабочых і работніц на радзе торфзаводаў (Асінторф, „Калектыўная праца“, „Чырвоная Беларусь“). Устаноўлены факты нездавальняючай работы фабрык Белшвейтрэста па выпрацоўцы вопраткі дзіцячага і школьнага асартымента. Ускрыты факты абмана дзяржавы ў справе прыёмкі хлеба на Новадворскім вінакураным заводзе, Чэрыкаўскага раёна. Выяўлена арганізаванае абвешванне насельніцтва пры выпуску піццёвай соды Менскім заводам „Чырвоны хімік“. Устаноўлена нездавальняючае санітарнае становішча Менскай бальніцы, дзе ў адным з карпусоў, побач з заразлівымі хворымі, знаходзіцца дзіцячы сад рабочых і служачых бальніцы. Выяўлен рад агіднасцей у рабоце чыгуначнага транспарта Беларусі і нескарыстанне на працягу года 50 грузавых аўтамашын НКЗемам Беларусі і г. д. і г. д.

Мы пакаралі, а ў радзе выпадкаў дабіліся пакарання вінаватых усіх ускрытых агіднасцей другімі арганізацыямі і прынялі рад мер да знішчэння ўстаноўленых недахопаў.

Але гэтых выпадкаў ускрытых агіднасцей і недахопаў, і яшчэ ў большай колькасці не ўскрытых, магло-б і не быць, калі-б былі ўцягнуты ў самым пачатку ў справу кантроля над кожным звяном нашага апарата самі рабочыя, работніцы, калгаснікі і калгасніцы ўсіх гэтых арганізацый і прадпрыемстваў, калі-б аб гэтых фактах своечасова ведалі совецкія, партыйныя, гаспадарчыя, грамадскія і спецыяльныя кантрольныя органы.

Тав. Сталін з усёй чоткасцю ўказаў на XVII з'ездзе партыі, што асноўная наша задача не караць вінаватых ва ўжо допушчаных агіднасцях і злоўжываннях, а масавым кантролем над усімі звеннямі нашага аграмаднага апарата папярэджваць самую магчымасць гэтых агіднасцей і злоўжыванняў.

Мы звярачваемся з просьбай да ўсіх работніц, жонак рабочых, калгасніц і працоўных жанчын Беларусі дапамагчы нам ва ўскрыцці ў самым пачатку недахопаў і скрыўленняў у рабоце нашых дзяржаўных, гаспадарчых, кааперацыйных і грамадскіх арганізацый, просім узяць пад свой кантроль усе звенні нашых апаратаў, паведамляючы нам аб усіх прыкмечаных недахопах, скрыўленнях і злоўжываннях.

Журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“ можа стаць і павінен стаць арганізатарам велізарнай жаночай актыўнасці ў барацьбе з усімі недахопамі, злоўжываннямі ў рабоце нашых апаратаў.

# ДА ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЕТА „ЗОТ“ ПА ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Падсумоўваючы бліскучыя вынікі работы цяжкай прамысловасці тав. Сталін на XVII партз'ездзе сказаў: „з усіх дасягненняў прамысловасці, заваяваных ёю за справаздачны перыяд, самым важным дасягненнем трэба лічыць той факт, што яна здолела за гэты час выхаваць і выкаваць тысячы новых людзей і новых кіраўнікоў прамысловасці, цэлыя пласты новых інжынераў і тэхнікаў, сотні тысяч маладых кваліфікаваных рабочых, якія асвоілі новую тэхніку і якія рушаць наперад нашу соцыялістычную прамысловасць“.

У святле гэтых дасягненняў склікаецца першы злёт „ЗОТ“ па цяжкай прамысловасці, які згодна рашэнняў ЦК КП(б)Б адбудзецца ў кастрычніку месяцы. Гэты злёт павінен паказаць, як зотаўцы на месцах спраўляюцца з задачамі, пастаўленымі перад імі другой пяцігодкай, як яны спалучаюць пафос будаўніцтва з пафосам асваення тэхнікі, як змагаюцца за канкрэтнае ажыццяўленне лозунга: „дагнаць і перагнаць“.

Без перабольшвання можна канстатаваць, што мы маем значныя поспехі ў рабоце „ЗОТ“ на месцах. ЗОТ'ам ахоплена значная колькасць рабочых, разгорнуты больш высокія формы соцспаборніцтва ў выглядзе грамадска-тэхнічных залікаў.

Дзесяткамі тысяч налічваецца рабочых, якія здалі тэхмінімум на „выдатна“ і „добра“. Сотні тысяч—на „здавальняюча“. Няма амаль ніводнага цэха па ўсіх прадпрыемствах Саюза, дзе-б на грудзёх лепшага рабочага і работніцы не красаваўся значок „ЗОТ“.

Зотаўцы ў першую чаргу выконвалі і перавыконвалі промфінплан, зніжалі брак, значна паляпшалі якасць прадукцыі, змяншалі колькасць паломак варштатаў, культурна абыходзіліся са станком і т. д. У выніку ўсяго гэтага расла зарплата і паляпшаўся дабрабыт рабочага.

Жанчына-работніца, якая толькі пасля Окцябрскай рэволюцыі ўступіла ў рады пролетарыята, па цяжкай прамысловасці займае зараз у радах „ЗОТ“ выдатнае месца. Але адначасова неабходна пабольшэвіцку падкрэсліць тыя недахопы, якія яшчэ маюцца ў нашай працы.

Перш за ўсё нам неабходна ахапіць усіх работніц тэхвучобай, адначасова аддаючы асаблівую ўвагу тым таварышам, у якіх адсутнічае дастатковая агульная адукацыя.

Неабходна палепшыць якасць вучобы, увязваючы тэарэтычныя веды з тэй работай, якую выконваюць работніцы штодзённа. Трэба наладзіць абмен вопытам зотаўскай працы паміж прадпрыемствамі.

Планы тэхпропаў павінны быць набліжаны да рэальных магчымасцей, яны павінны ўлічваць узровень развіцця, веды рабочага, а таксама тэхнічную ўзброенасць самых прадпрыемстваў.

Работніцы цяжкай прамысловасці павінны ўлічыць усю важнасць пытання аўладання тэхнікай з тым, каб поўнасцю ўключыцца ў работу добраахвотнага таварыства „ЗОТ“. З гэтай прычыны да пачатку злёту неабходна разгарнуць велізарнейшую падрыхтоўчую работу з такім разлікам, каб работніцы прышлі да гэтага злёту тэхнічна-ўзброенымі.



Аргова Ася — слесар-выдатніца, рэдактар газеты.

Разам з гэтым нельга абмінуць той аграмаднай ролі, якую адыгрываюць работніцы-зотаўкі ў рабселькораўскім руху, непасрэдна на заводах, фабрыках і ў калгасах. Работа па падрыхтоўцы да злёту павінна быць увязана з работай па падрыхтоўцы да ўсебеларускага з'езда рабселькораў, які адбудзецца неўзабаве пасля злёту. Важна адзначыць гэтыя мерапрыемствы таму, што і работа з'езда рабселькораў, і работа злёту „ЗОТ“ дадуць нам сотні і тысячы новых актывістак, якія пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі будуць змагацца за тое, каб „СССР ператварыўся ў другой пяцігодцы ў тэхнічна і эканамічна незалежную краіну, у самую перадавую ў тэхнічных адносінах дзяржаву ў Еўропе“.

З. Д.

---

**Цэнтральнай задачай таварыстваў па аўладанні тэхнікай з'яўляецца павышэнне тэхнічнай кваліфікацыі мас на аснове барацьбы за ажыццяўленне тэхнічных паказчыкаў промфінпланаў заводаў і ўдзел у барацьбе за соцыялістычную і тэхнічную рэканструкцыю ўсёй гаспадаркі краіны.**

**(З пастановы ЦК ВКП(б).**

# КЛАПАЦІЦЦА АБ БЫТАВЫХ ПАТРЭБАХ УДАРНІЦ - ЧЫГУНАЧНІЦ

„Задача рашучага палепшання транспарта з'яўляецца той чарговай і актуальнейшай задачай, без вырашэння якой мы не можам рушыць наперад" (СТАЛІН).



Тав. Казанцэвіч—нач поезда № 89—90.

За апошні час у рабоце нашага чыгуначнага транспарта маецца значны зрух. Пастанова ЦК ВКП(б) і рашэнні XVII-га партз'езда аб транспарце з'яўляюцца той асновай пры дапамозе якой нашы чыгуначніцы штодзённа змагаюцца за большэвіцкую перабудову сваёй работы.

Кожны чыгуначнік, рабочы, работніца памятаюць словы тав. Кагановіча аб тым, што рашаючую ролю ў сучасны момант маюць праверка выканання, аператыўнае кіраўніцтва, дысцыпліна.

Рэдакцыя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі" праверыла ў дарозе работу соцспаборнічаючых паміж сабой двух жаночых брыгад паказацельнага поезда № 89—90, які курсіруе на ўчастках Менск—Днепрапетроўск. Іхняя работа з'яўляецца прыкладнай ва ўсіх адносінах. Брыгады цалкам пабудавалі сваю работу на аснове ўдарніцтва і соцспаборніцтва і ў гэтым сэнсе могуць быць прыкладам для іншых чыгуначных брыгад.

Вагоны гэтых брыгад здзіўляюць пасажыраў сваёй чыстатой. На падлозе каўры, на вокнах фіранкі, на сталох графіны з гатаванай вадой, на сценках партрэты правадыроў. У вагонах маецца радыё і насценгазета. Абслугоўванне пасажыраў самае ўважлівае і культурнае.

На старонках нашага друку мы ўжо некалькі разоў пісалі аб вагонах „маці і дзіцяці" і толькі пры праверцы гэтага поезда на практыцы бачылі тую карысць, якую прыносяць такія вагоны.

У асабліва цяжкіх умовах праходзіць работа брыгад пры пасадцы пасажыраў на вялікіх станцыях, як Ромны, Пяціхаткі, Рамадан, Крэменчуг і іншыя. Білетныя касы гэтых станцый не лічацца з наяўнасцю месц у вагонах і прадаюць білетаў больш як належыць. У дарозе мы наглядалі з якой вытрымкай правадніца арганізоўвае пасадку на гэтых станцыях, ужываючы толькі ў крайніх выпадках меры рэпрэсіўнага ўздзейнічання (штраф), у большасці-ж выпадкаў ужываюцца метады пераканання і растлумачвання.

Начальнікі поезда т. т. Савіч і Казанцэвіч самі з'яўляюцца найлепшымі ўдарнікамі брыгады і гэта з'яўляецца лепшым стымулам для ўсіх астатніх працаўнікоў.

Неабходна адзначыць лепшых ударніц-праваднікоў т. т. Бабаеву Марфу Усцінаву, якая працуе на чыгунцы 16 год, старую работніцу, члена партыі, тав. Адамчык, тав. Жур Алену Рыгораўну, тав. Лінчэўскую Матрону Дзямянаўну, якая працуе на чыгунцы 25 год, тав. Кашкурэвіч, здаўшую тэхмінімум лепш за ўсіх у першай брыгадзе, тав. Айзельман—парторга другой брыгады, Сцепанаву, Маруковіч і інш. Але не толькі сваімі праваднікамі могуць ганарыцца гэтыя брыгады. Тут неабходна таксама адзначыць работу лепшых ударніц-змазчыц т. т. Шэўчанка Марылю, Фёдараву Ядвігу, у якіх за ўсе рэйсы буксы былі ў поўнай спраўнасці і не было адцэпак.

Узоры добрасумленнай працы паказваюць электраманцёры гэтых брыгад тав. Гінкоўская Ганна і Ліўшыц Фаня, якія добрасумленна працуюць у дарозе па асвятленні поезда, адцэпкі і злучэнні вагонаў.

Аб якасці работы гэтых таварышоў і брыгад у цэлым яскрава гавораць запісы ў кнізе пасажыраў, дзе маюцца вельмі добрыя водгукі.

Соцыялістычныя метады працы палепшылі не толькі якасць работы, але і агульна-культурны ўзровень чыгуначных работніц.

Работніцы ўсвядомілі ролю друку, і тую значную работу нашага журнала, які аказваў брыгадам усямерную дапамогу ў іхняй штодзённай працы. У выніку гэтага абедзве брыгады на 100 проц. падпісаліся на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі" і выклікаюць на падпіску іншыя брыгады.

Спаборніцтва разгорнута не толькі паміж двума брыгадамі, але і ўнутры брыгад—работніцы аднаго вагона спаборнічаюць з работніцамі другога вагона.

Але побач з гэтымі поспехамі неабходна падкрэсліць слабасць партмасавай работы і вельмі дрэннае соцбытавое абслугоўванне работніц-чыгуначніц. Сярод работніц ёсць малапісьменныя і ніякіх крокаў да іх вучобы не прымаецца.

Лепш справа абстаіць з тэхвучобай, якая праводзіцца рэгулярна, але не заўсёды забяспечваецца падручнікамі.

Старшыня мясцкома Кункевіч, па заявах работніц не толькі нічога не робіць, каб палепшыць культурнае і бытавое становішча работніц, але маюцца прыклады нетаварыскіх, грубых адносін, да работніц. Праформгі бры-



Гінькоўская Ганна, электраманцёр і радыстка—лепшая ўдарніца брыгады Казанцэвіч.

гад да гэтага часу нікім не інструктуюцца, а парторг тав. Айзельман (брыгада № 1) прадстаўлена сама сабе і не ведае, што яна павінна рабіць, як парторг.

Кіруючым органам 6-га ўчастка службы цягі неабходна ў хутчэйшы час наладзіць працу, каб нашыя ўдарніцы-чыгуначніцы і перш за ўсё гэтыя дзве ўдарныя брыгады, атрымалі тую ўвагу, якую яны заслужылі. Аб іх працы павінен ведаць увесь вузел.

Іншыя брыгады павінны вучыцца ў іх па-большэвіцку працаваць.

Кіраўніцтву 6-га ўчастка трэба адзначыць работу ўдарніц-чыгуначніц. Азначаныя брыгады заслужылі гэтага.

Неабходна, каб ударніцы-чыгуначніцы былі прэміраваны. Трэба гэтых ударніц ахоўваць—прадстаўляючы ім пры водпуску дамы адпачынку, санаторыі, курорты і т. д. Таксама пасля прыезда з рэйса даць ім магчымасць адпачыць адзін дзень у доме адпачынку пятага дня ўдарніка.

Па-большэвіцку змагацца за палепшанне іх соцбытавых умоў. На апошнім агульным сходзе абоіх брыгад, начальнік поездных брыгад тав. Апаровіч абяцаў наладзіць усе гаспадарчыя недахопы ў хуткім часе.

Чыгуначніцы чакаюць ажыццяўлення абяцанага.

Пад кіраўніцтвам парторганаў, работніцы-чыгуначніцы будуць змагацца, каб наш транспарт быў самым лепшым у свеце.


Лепшыя ўдарніцы-праваднніцы. Злева направа: тт. Муганцава, Сцепанава, Лінчэўская.

Саліна.

# ВОЛЬГА КАШКУРЭВІЧ

— Да 14 год я жыла ў Слуцку,—так пачала сваю размову Вольга Кашкурэвіч—праваднніца жаночай брыгады поезда № 89—90.

— Ды хіба-ж гэта жыццё, не жыццё, а жудасць. Бацькі ад цёмнага ранку, да цёмнай ночы, нібы краты, капаліся ў зямлі, а я прымушана была ісці да багатыроў у нянькі. Цяжка было бацькам жыць. І вось маці аднойчы сказала мне: „ідзі, Вольга, рабіць, няма чаго сядзець на шыі“. Зразумела я гэтыя словы, горка зрабілася. Але трэба было ісці, ісці зарабляць свой хлеб.

Так я пачала батрачыць: няньчыць дзяцей, працаваць да позняга і праклінаць сваё нікчэмнае жыццё, жыццё батрачкі.

Неўзабаве захварэў бацька. Хвароба была цяжкой і тыдняў праз пару бацька памёр. Засталася я з маткай адна. Жыць зрабілася яшчэ цяжэй. Маці не магла мяне пракарміць і я мусіла паехаць у Менск да старэйшага брата.

У Менску для мяне—16-гадовай дзяўчынкі пачалося новае, радаснае жыццё. Пасля жорсткай кулацкай эксплаатацыі я трапіла ў рабочы калектыў.

Кваліфікацыі ў мяне не было і я пачала працаваць прыбіральшчыцай у вагонным дэпо. Спрытна працавала, старалася. Але ўвесь час мяне цягнула набыць спецыяльнасць. Тады я наважыла падаць заяву на курсы праваднікоў.

Спачатку хвалявалася, думала:—а што, калі не прымуць, адмовяць... Але ўсё абышлося добра. Мяне прынялі. З вялікай ахвотай я пачала вучыцца на курсах. Удзень працавала ў дэпо, а ўвечары бегла на курсы.

Спачатку цяжка было сябраваць з кніжкамі ды алоўкамі, але жаданне, вялікае жаданне набыць спецыяльнасць перамагло. Я старанна вучылася і скончыла курсы з адзнакай на „добра“.

І калі мне выдалі пасведчанне, што я прыгодна быць праваднніком, сэрца неяк запрыгала, заёкала ад радасці і я ўпэўнена паехала ў першы рэйс. А зараз вось ужо тры гады, як я езджу па нашай чыгунцы. За ўвесь час не маю ніводнай заўвагі. Тут Вольга неяк ўсхвалявана ўносіць маленькую заўвагу. „За сваё глупства праўда мела адну вымову, але гэта было два гады таму назад. Цяпер не паўтарыцца“.

Не так даўно я здала тэхэкзамен „на выдатна“.

Работу сваю люблю і ганаруся ёю. За гэты час дасягнула значных перамог, але ёсць, зразумела, і недахопы. Вось хоць-бы тут... Вольга працягвае мне паездны журнал, дзе не адна прыгожая старонка запісана аб ёй і яе рабоце.

— „Таварыш Кашкурэвіч сапраўдны соцыялістычны гаспадар свайго вагона № 45—14. Гаварыць аб парадку і чыстаце не даводзіцца. Вагон яе чысты, прыгожы і ўтульны. Пасажыр абслугоўваецца культурна і акуратна, таму што на кожным кроку адчуваецца гаспадарчае вока тав. Кашкурэвіч“. Так канчаецца запіс у паездным журнале аб вагоне № 45—14—напісаны пасажырам. Такіх запісаў шмат.

Так працуе ўдарніца чыгуначнага транспарта—Вольга Кашкурэвіч.

С. Богуш.

# Рэдактаршы

*(Нарыс).*

Раніцою на досвітку, нібы прачнуўшыся ад сна, на ўскраінах Менска абзываюцца гудкі. Спачатку хрыпла, потым выпростваючыся і ўсё больш набіраючы сілы, працягла гучаць яны над горадам, склікаючы работнікаў брыгад і цэхаў, работніц фабрык і заводаў да радаснай, бадзёрай працы.

Раніцою на досвітку на ўскраінах Менска прачынаюцца гоман і шум. Па вузкіх вуліцах густою хваляю спяшаюць натоўпы рабочых і работніц, плывуць гамонкі і смех над спелымі садамі, што абвісаюць нізка, цераз платы, на брук. Пад імі раніцой на заклікі гудкоў ідуць, сцяшаюцца: ткальніцы, наборшчыцы, сартыроўшчыцы шчотачнай фабрыкі. Грукат іхняй хады і галасы далёка разносяцца па яшчэ пустых вуліцах.

Каля фабрыкі натоўп гусцее. Рознакалёрныя хусцінкі, і кепі, мерна праходзячы праз вароты, таропка расплываюцца брыгадамі па цэхам. Там-сям мітусяцца брыгадзіршы, раздаючы заданні сваім брыгадам. Яшчэ момант і загурчаць станкі, загрукоча шчотачная „Крупскай“ несціханым гулам.

* * *

Сіма Мендэлевіч—рэдактарша наборнага, з‘явілася сёння на фабрыку досвіта. Агледзіўшы свой цэх і ўпэўніўшыся ў чыстаце і парадку, яна паднялася ў партком і села за столік. Сёння ў Сімы Мендэлевіч асаблівы дзень. Да пачатку працы ёй трэба прагледзіць і выправіць матар‘ял газеты, падрыхтаваць даклад аб з‘ездзе рабселькораў і галоўнае напісаць перадавіцу, якая-б усхвалявала, узняла работніц на барацьбу з прарывам.

Заклапочаная яна сядзела ў цішыні, гартаючы паперкі і робячы адзнакі ў сваім блакноце. Перад ёю ў заметках раскрываліся прычыны недахопаў, дасягненні брыгад і свежыя факты з жыцця самога цэха. Сіма ведала кожную дэталь яго, кожную дробязь, таму, што сама працуе ў цэху, сама жыве тымі клопатамі, якімі жывуць усе работніцы.

Вось брыгада Ляшчынскай Стасі. Лепшая брыгада! Выкананне промфінплану—108 проц., але пра асобных работніц заметкі дрэнныя. І Сіма зазначае ў сваім блакноце: пагутарыць з адстаючымі, перраканаць.



Тав. Мендэлевіч Сіма—рэдактар штодзёнкі.

Вось імёны прагульшчыц, якія заўсёды позняцца на работу і зрываюць промфінплан. Запісы ў блакноце Сімы растуць, яднаюцца і вырастаюць у палкія заметкі, вострыя і хвалюючыя сваёй канкрэтнасцю.

Вось газета адрэдагавана. Засталося толькі перапісаць матар‘ял начыста і вывесіць на відным месцы. Работа ўдалася і праблеск задаволенасці кладзецца на твар Сімы.



Тав. Левіна—рэдактар штодзёнкі.

Захопленая сваёй работай, яна не заўважыла нават, як у пакой увайшла яе таварышка Левіна—рэдактарша газеты ткацкага цэха.

— Добры дзень, Сіма! — кідае яна.—Працуеш усё?

— Працую ўсё,—адказвае з усмешкай Сіма,—а ты што, скончыла газету?

— Скончыла,—уздыхае Левіна,—але прышла вось параіцца.

— А ў чым справа?

— Разумееш, учора рабіла даклад у цэху, разгарнулася спаборніцтва, але вось не ўсюды яшчэ добра. Некаторыя работніцы новага асартыменту палохаюцца.

— А ты вазьмі шэфства над імі, пагутар, пераканай.

— Прыдзецца так і зрабіць,—згаджаецца Левіна, нібы абдумваючы абстаноўку пры якой ёй давядзецца гутарыць з упартымі.—Я гэта абдумаю. Потым яна пачынае хадзіць па пакоі, аглядаючы партрэты правадыроў і стол сакратара. На момант яна спыняецца і нібы успомніўшы тое, аб чым хацела яшчэ раней сказаць сваёй таварышцы, дадае:

— А помніш, Сіма, работніцу Гучок з майго цэху? Ну, пра якую заметка была, што яна сама сабе прыпісвала тканіну.

— Гучок?—Сіма на хвіліну задумваецца,—чарнявая такая? Помню! А што?

— Пакінула фабрыку, засаромілася...

— Ну, што-ж,—сама вінавата,—адказвае Сіма,—а заметка правільная!

Гутарачы так паміж сабою яны не заўважылі, як паступова беглі хвіліны, як збіраліся ў цэху шчотачніцы, напаўняючы іх жыццём і бадзёрасцю.

Гэтым часам за вакном прарэзліва загучэў гудок. Развітаўшыся, таварышкі разышліся па сваіх цэхах.

Пачыналася праца.

С. Дар.

# У Барысаве да зімы не рыхтуюцца

Усім вядома, якое значэнне партыя надае палепшанню соцбытавых умоў рабочых і як трэба нашым гаспадарнікам увязваць гэтае пытанне з колькасным і якасным выкананнем промфінплана.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове яшчэ раз напомніў партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям аб належнай падрыхтоўцы да зімы: рамонт рабочых кватэр, забеспячэнне рабочых гароднінай, апалам, абуткам, вопраткай і г. д. Па цэламу раду прадпрыемстваў Беларусі шырока разгорнута праца па аказанні дапамогі рабочым матэрыяламі і сродкамі. Напрыклад на заводзе імя Ланцуцкага (Гомель) рабочым адпушчана на рамонт кватэр каля 300 кбм. абшыўных дошак, 90 кгр. жалеза і 25 лістоў шкла. Для 14 прадпрыемстваў горада Віцебска для гэтай мэты выдана рабочым 130 тысяч рублёў.

10 прадпрыемствам Бабруйска выдана 26.550 руб. На фабрыцы імя Кагановіча (Менск) выдана для гэтай мэты 3.000 штук цэглы, 52 кгр. цвікоў, 1/2 тоны вапны і г. д.

Прыведзеныя факты сведчаць аб тым, што кожнае прадпрыемства мае магчымасць аказаць шырокую дапамогу рабочым у рамонце кватэр і іншых патрэбах, калі гэтаму пытанню аддаецца належная ўвага.

Аднак ёсць яшчэ такія арганізацыі, якія жадаюць прыкрыць сваю бяздзейнасць, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў і матэрыялаў. Па лістах рабкорак, дасланых у рэдакцыю, і абследванню, Барысаўскія прадпрыемствы і Райпрафсовет нічога не робяць, каб дапамагчы рабочым падрыхтавацца да зімы,—да Окцябрскіх свят.

Як-жа там абстаіць гэтая справа? Возьмем прыклад з палівам; калі рабочыя асноўных прадпрыемстваў Барысава атрымалі толькі 1910 кбм. дроў, дык астатняму насельніцтву выдана 2260 кбм., пры чым, і сярод прадпрыемстваў размеркаванне азначаных дроў не заўсёды было правільным. Друкарня—дробнае прадпрыемства, атрымала 130 проц. усёй належачай ёй нормы, а завод „Домбаль" і фабрыка „Пролетарская перамога"—буйнейшыя прадпрыемствы Барысава, атрымалі ўсяго 30 проц. патрэбнасці.

З боку Райпрафсовета адсутнічаў кантроль за правільным размеркаваннем паліва.

Такое-ж самае становішча наглядаецца і ў справе арганізацыі майстэрняў па рамонту абутку і адзення. Кравецкая майстэрня існуе толькі на заводзе „Домбаль", але і яна не задавальняе патрабаванняў рабочых.

Па шавецкім майстэрням па плану за першае паўгоддзе патрэбна было адрамантаваць 37.000 пар абутку, а зроблена толькі 6421 пара. Паасобныя трохкутнікі прадпрыемстваў („Комінтэрн", „Пролетарская перамога") недаацэньваюць значэння пачынанчых майстэрань і фактычна тармозяць арганізацыю іх. На фабрыцы „Пролетарская перамога" амаль зусім ліквідавана кравецкая майстэрня. Дрэнна абстаіць справа з рамонтам кватэр. Па жактах адсутнічае вучот, адсутнічае парадак рамонта ў першую чаргу ўдарнікам. 2-гі жакт адрамантаваў кватэры пераважна служачых у той час, як рабочы электрасеці тав. Занько жыве у зусім разваленай кватэры і яму ў рамонце адмаўляюць. Якасць рамонту ў жактах, асабліва ў жакце № 2, недапушчальная.

Замест замены асобных дошак у падлозе, ставяцца латкі, кватэры, якія пачалі рамантавацца, не заканчваюцца і не поўнасцю ўтвараецца неабходны рамонт. Нам пішуць, што работніцы Стрэмглоўскай (фабрыка „Пролетарская перамога"), якая мае 25-гадовы вытворчы стаж—герой пяцігодкі, рашылі адрамантаваць кватэру, але рамонт быў зроблен так дрэнна, што ў сучасны момант кватэра зноў патрабуе рамонта.

Гэта сведчыць аб тым, што кантроль за якасцю рамонта і колькасцю яго пастаўлен вельмі слаба. Спячку Барысаўскіх арганізацый нічым нельга апраўдаць. Газеце „Большэвік Барысаўшчыны", якая мае вялікі актыў рабкорак, трэба неадкладна узняць усю пролетарскую грамадскасць горада, каб ліквідаваць азначаны прарыў. Асабліва гэта пытанне адносіцца да рабкорак, якія з'яўляюцца найлепшым нашым актывам на прадпрыемствах. Усвядоміць, што пытанне жыццёва-бытавых „дробязей" з'яўляецца магутным вагаром, ад якой залежыць якасць працы работніц на прадпрыемствах і ўцягненне новых кадраў работніц.

Барысаўскі раён, які з'яўляецца перадавым раёнам на Беларусі, павінен па-большэвіцку скрыстаць кожны дзень для таго, каб своечасова падрыхтавацца да зімы.

З. Д.

# Апраўдаем ганаровую назву сталінскай брыгады

Вязальны цэх панчошнай фабрыкі „КІМ" (Віцебск)—самы перадавы. Ён заўсёды перавыконвае промфінплан і дае добрую якасць прадукцыі.

21 брыгада пераведзена на хоз. разлік. У цэху 238 зотаўцаў. На значок ГТО (гатоў да працы і абароны) здало 70 чалавек, норму на варашылаўскага стралка—38 чалавек.

За добрыя паказальнікі наш цэх атрымаў пераходны чырвоны сцяг трыкутніка фабрыкі.

У сваёй брыгадзе я зараз прафорг. Раней я адна толькі была зотаўкай. Але пасля ўсебеларускай канферэнцыі зотаўцаў лёгкай прамысловасці, на якой я была дэлегаткай, я ўзялася за наладжванне тэхвучобы. Перакanала ўсіх работніц брыгады ў неабходнасці аўладання тэхнікай. І вось у выніку праведзенай масавай работы ўсе работніцы пачалі наведваць тэхгурток. Заняткі праходзілі вельмі добра і цікава, бо кіраўнік гуртка тав. Высакоўскі ўмеў добра паставіць работу.

Вынікі радасныя—усе 12 чалавек, якія займаліся ў гуртку, здалі на „выдатна" на значок „ЗОТ". Брыгада атрымала ганаровае імя тав. Сталіна, за якое мы доўга змагаліся.

Штомесячна мы выконваем промфінплан на 106—110 проц. Якасць у нас таксама добрая. Па плану дапушчаецца 15 проц. штопкі, а мы даем 5—6 проц. у месяц. За дзве дэкады жніўня мы мелі эканоміі іголак на 106 штук.

Усе работніцы брыгады прымаюць актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Да XX МЮД'а мы рапартавалі аб сваіх дасягненнях.

Наша брыгада дапамагае падшэфнаму калгасу. У выхадныя дні мы хадзілі на праполку і ўборку. Пісалі таксама лісты калгасніцам, перадаючы праз іх свой лепшы вопыт работы.

Але мы не спыняемся на нашых дасягненнях. У далейшым будзем яшчэ больш змагацца за высокія вытворчыя паказальнікі, каб апраўдаць ганаровую назву сталінскай брыгады.

С. Шынельнікава.

# Насустрач трэцяму Ўсебеларускаму з'езду рабселькораў

## Самаабавязацельствы памочніц брыгадзіраў у сувязі з заклікам калгасніц-ударніц у рады селькораў, які абвяшчае „Палітаддзельская праўда“

Жанчына - калгасніца паказала сябе, як вялікая рашаючая сіла ў барацьбе за бальшэвіцкі калгас, за заможнае жыццё, за пасяховае ажыццяўленне першай запаведзі—выканаць у першую чаргу абавязкі перад пролетарскай дзяржавай.

Гэта-ж факт, што ў вялікай меры, дзякуючы ўдарнай рабоце калгасніц, пры ўборцы, малацьбе і нават пры адпраўцы на здатачныя пункты, наша зона МТС выканала поўнасцю план хлебапаставак да 1-га верасня—на тры месяцы раней, чым у мінулым годзе.

Гэта-ж факт, што па ініцыятыве жанчын-калгасніц і пры іх самым актыўным удзеле цяпер разгарнулася барацьба за датэрміновую здачу трасты і валакна найвышэйшага нумару. І мы бачым, што першыя два абозы з ільном, якія адбыліся 1-га і 9-га верасня—гэта абозы жаночыя. Самі жанчыны падрыхтавалі лён і самі прывезлі яго здаваць дзяржаве.

Калгасніца ў калгасе стала гаспадаром нароўні з мужчынам. Яна ўжо задае тон. Яна становіцца нават камандзірам калгаснай вытворчасці.

Але слаба, зусім слаба калгасніца ўцягнута ў грамадскае жыццё калгаса. Зусім мала мы маем калгасніц камандзіраў грамадскай думкі—селькорак, якія-б пісалі ў калгасныя насценгазеты, у „Палітаддзельскую праўду“, у журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“. А партыя-ж дала лозунг, што „кожны рабселькор павінен быць ударнікам, а кожны ўдарнік—рабселькорам“.

Выходзіць, што ўдарніц-калгасніц, якія паказваюць высокія тэмпы работы і высокую якасць на полі, на таку, на мяльнатрапальным пункце, на ферме, у нас шмат. Іх сотні тысяч. А селькорак? Іх можна і на пальцах пералічыць.

Друк—самую моцную, самую вострую зброю партыі—мы зусім слаба скарысталі. А калі-б удзельнічалі ў ім, то дабіліся-б яшчэ большых поспехаў, мы-б перадалі наш вопыт барацьбы за высокі ўраджай, за высокі нумар трасты і валакна, за высокі ўдой. Хіба мала ў нас гэтага вопыту.

Праз друк мы-б выкрывалі, ганьбілі гультаёў, зрыўшчыкаў высокага ўраджаю, бракаробаў, кулацкіх падпявал. А ў нас яшчэ ёсць многа такіх.

З другога боку праз друк мы-б паказалі нашых лепшых ударнікаў, знатных людзей, майстроў высокага ўраджаю і ганаровай маркі нашага ільну.

Гэта больш падняла-б іх дух, іх жаданне яшчэ лепш работаць і адстаючыя наследвалі-б іх прыкладу.

Мы, памочніцы брыгадзіраў, якія заклікаиы палітаддзелам весці палітмасавую работу ў брыгадах сярод калгасніц, асабліва адчуваем вялікую сілу насценгазеты. Газета баявая, зубастая, якая часта выходзіць, у якую многія пішуць, якая змагаецца за давядзенне пачатай справы да канца—такая газета аказвае лепшую дапамогу ў нашай рабоце. У той брыгадзе, дзе выдаецца такая газета, і гультаёў, і бракаробаў, і прагульшчыкаў не будзе, заўсёды гаспадарча-палітычныя кампаніі будуць выкананы з поспехам.

Трэба прызнацца, што мы самі да гэтага часу недаацэньвалі ролю друку, ролю селькора. Таму нядзіва, што сярод нас, памочніц брыгадзіраў, у колькасці 200, знойдзецца толькі 4—5 селькорак. Гэта—вялікі недахоп. І мы яго цяпер знішчым.

У адзнаку надыходзячага 3-га Ўсебеларускага з'езда рабселькораў і 10 гадавіны журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“, мы абвяшчаем сябе селькорамі і будзем актыўна ўдзельнічаць у калгасным друку, „Палітаддзельскай праўдзе“ і журнале „Работніца і калгасніца Беларусі“. Мы правядзем вялікую работу па канчатковай ліквідацыі непісьменнасці, па разгортванні палітвучобы сярод калгасніц нашых брыгад.

Памятаючы, што пяро селькора павінна быць падмацавана асабістым прыкладам, мы абавязваемся змагацца, каб калгасы нашай зоны першыя ў БССР поўнасцю здалі трасту не пазней 20-га верасня, не ніжэй 1,75 нумару, а валакно—да 25 верасня не ніжэй 10 нумару, каб нашы калгасы паспяхова падрыхтавалі зімоўку для жывёлы. За вырашэнне гэтых задач мы будзем змагацца, як бальшэвікі з агеньком, у брыгадах і праз калгасны друк.

Мы абавязваемся, каб у час апрацоўкі і здачы валакна ў нашых брыгадах штодзённа выходзілі газеты і сігнальныя лісткі.

Мы абавязваемся стварыць грамадскі кантроль, які-б сігналізаваў на кожны выпадак браку і нізкасортнасці, каб брак аднаго працэсу апрацоўкі не быў-бы прынят другім працэсам, каб кожная вязанка валакна і трасты мела-б пашпарт, хто іх апрацоўваў, каб штодзённа запаўняліся чырвоныя і чорныя дошкі.

Пачатак нашай селькораўскай дзейнасці адзначым лістом, у якім мы калектыўна раскажам у юбілейным нумары журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“, як мы выканалі датэрмінова і высокаякасна план ільноздачы.

Па даручэнню нарады:

Жыхарава Куліна („Усходы Леніна“), Голубева Елена („Новы шлях“), Афанас'ева Сцепаніда (імя Сталіна 2), Алексінава Еўдакія („5-годка ў чатыры гады“), Зайцава Надзя („Окцябр“), Брабоўкіна Клаўдзя („Авангард“), Багдановіч Проска („Герой працы“), Бараўкова („Чырвоная Дуброўна“), Бортнікава Марфа („Новыя Гараны“), Лапкоўская В. С. („Чырвоная зорка“).

(Перадрукавана з палітаддзельскай газеты „Палітаддзельская праўда“).

# ПРАЕКТ РЭКАНС

Невялічкі, закінуты на ўскраіне рускай імперыі, брудны, гандлёва-рамясловы гарадок з мяшчанска-ўласніцкімі звычаямі—вось чым быў Менск у часы царызма. Менск нанава нарадзіўся з Окцябрскай рэвалюцыяй. Ранейшы заштатны, ускраінны гарадок—стаў бурным горадам, сталіцай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, адным з важнейшых палітычных цэнтраў Саюза.

У выніку ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, ранейшы гандлёва-рамясловы гарадок становіцца адным з буйнейшых прамысловых гарадоў Совецкага Саюза. Даволі сказаць, што больш чым у 10 разоў вырасла колькасць фабрычна-заводскіх рабочых, у 50 разоў павялічылася валавая прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў горада ў параўнанні з дарэвалюцыйным часам.

Менск вылучаецца, як адзін з буйнейшых культурных цэнтраў Саюза. Ніводнай вышэйшай школы не было да рэвалюцыі, а цяпер: 12 вышэйшых навучальных устаноў, 22 навукова-даследчых інстытутаў з Акадэміяй Навук на чале, якая мае 17 інстытутаў.

Менск стаў найбольш населеным горадам БССР. Непазнавальна змянілася яго соцыяльная структура. Да рэвалюцыі ўдзельная вага рабочых у горадзе складала 1,3 проц., а цяпер яна вырасла да 19,3 проц. І ўсё гэта толькі за некалькі год.

Кожны дзень—новыя перамогі. Здабытае нас не задавольвае, мы хочам яшчэ большага і лепшага. На тое большэвікі і заваявалі жыццё, каб яго перабудоўваць, рабіць прыгожым, багатым і цікавым, аб чым маглі толькі марыць лепшыя людзі ў гісторыі чалавецтва.

Заўтрашні Менск—гэта вялікі, квітнеючы соцыялістычны горад.

Нядаўна ў Дзяржплане адбылася шырокая нарада, якая абмеркавала асноўныя палажэнні праекта планіравання і соцыялістычнай рэканструкцыі Менска ў другой і трэцяй пяцігодках. На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі навукова-даследчых інстытутаў, наркаматаў, Горсовета і прадпрыемстваў.

Што гэта за праект, над якім працавалі прафесары і інжынеры?

Праект прадугледжвае вялікі рост прамысловасці сталіцы БССР. Тры прамысловыя раёны будзе мець горад. Існуючыя прадпрыемствы ў раёне вуліцы Варашылава разам з праектуемымі там створаць асноўны прамысловы раён горада. Тут будзе пабудавана новая абутковая фабрыка, завод пластычных скур, з выпускам 4 000 тон у год, завод лазня-пральнага абсталявання. Намечана пашырэнне завода імя Варашылава, карэнная рэканструкцыя заводаў „Ударнік", ланцугоў „Галля" і інш.

У раёне Старажоўкі праектуецца пабудова дзінnікавага завода, на якім будзе працаваць к 4.000 рабочых.

Абутковая фабрыка імя Кагановіча будзе да дзена да поўнай магутнасці—выпрацуе 3,1 м пар абутку ў год. Завод імя Молатава перааб люецца выключна для выпуска меблі на суму 8 млн. рублёў у год. Значна вырасце вытворчас фабрыкі „Комунарка", якая будзе даваць у г да 15 тысяч тон цукеркаў.



Праект пабу

Ствараецца магутная вытворчасць культтавара паліграфія, кінопрамысловасць, выпрацоўка пал тэхнічнага абсталявання, дзіцячых цацак. Выра туць новыя, вялікія прадпрыемствы. Запраекта вана пабудова кіно-фабрыкі з выпускам у го 35 карцін. Фабрыка дзіцячых цацак дасць дл дзяцей рабочых і калгаснікаў на 2,5 млн. руб у год прыгожых, дасціпных і танных цацак. Шко лы рэспублікі атрымаюць на два мільёны рублё палітэхнічнага абсталявання ў год, якое будзе вы рабляць спецыяльна пабудаваная фабрыка.

Такі вялікі рост усіх галін прамысловасці па трабуе вялікай колькасці рабочых. На менскіх прадпрыемствах будзе занята звыш 40.000 рабо чых, сярод якіх значная колькасць будзе жанчын

Праект прадугледжвае надзвычайна вялікі рост гарадскога аўтатранспарта. Каля паўтары тысячы

# ...ТРУКЦЫІ МЕНСКА

грузавых машын, каля 100 аўтобусаў, каля тысячы легкавых і амаль 200 спецыяльных машын будуць курсаваць па вуліцах сталіцы БССР. Намечана пабудова аўтавакзала і інтурысцкай базы. Урэгуляванне і злучэнне Свіслачы судаходствам з вялікім Дняпром праз Бярэзіну дасць магчымасць скарыстаць яе для груза-перавозак. Будзе пабудован рачны порт. Ускраіны горада і прамысловыя раёны злучаюцца трамвайнымі лініямі з цэнтрам горада.



...театра ў Менску

У цэнтральнай частцы горада намечана стварэнне культурна-асветнага цэнтра рэспубліканскага значэння. Тут будуць: вялікі Дзяржаўны тэатр оперы і балета, тэатр драмы, яўрэйскі, рускі і польскі нацыянальныя тэатры, цырк, планетарый, выстаўкі, бібліятэкі; дамы: навукі і тэхнікі, мастацтва, асветы, фізкультуры, калгасніка, Чырвонай арміі і г. д. Гэтыя ўстановы зоймуць каля 30 гектараў плошчы. Дзесяткі навуковых і навучальных устаноў раскінуцца на плошчы каля 100 *га*, а бальнічны гарадок рэспубліканскага значэння—30 гектараў. У ВНУ будзе навучацца 12 тысяч чалавек працоўнай моладзі, а разам з тэхнікумамі і рабфакамі—22 тысячы чалавек.

Разам з ростам прамысловасці, ростам усіх галін гаспадаркі і культуры Менска значна вырасце і насельніцтва. Колькасць жыхароў перавысіць 300 тысяч чалавек.

У сувязі з гэтым шырока разгорнецца новае жыллёвае будаўніцтва. Працоўныя атрымаюць добра-абсталяванае і зручнае жыллё, якое будзе адпавядаць узросшым культурным запатрабаванням. Асноўным тыпам жыллёвага будаўніцтва будуць каменныя дамы не менш чатырох паверхаў. Кожная кватэра мае ад двух да чатырох пакояў і асобную кухню. Пры кватэры з трох пакояў—асобная ванна, а з двух пакояў—душавая кабінка.

Жыллёвае будаўніцтва разлічана на поўны ахоп працоўных усімі формамі соцбыцця і культурнага абслугоўвання. Для гэтай мэты прадугледжваецца арганізацыя сацыяльна-бытавых гаспадарчых калектываў. Гэтыя калектывы маюць такія агульныя ўстановы, як сталовую, пральню, дзіцячыя яслі, здраўпункт, аптэка-размеркавальнік, школу, прамтаварны і прадуктовы магазіны, цырульню і інш. Разумная арганізацыя быта вызваліць працоўную жанчыну ад розных хатніх клапот для шырокай грамадскай работы, значна павялічыць колькасць працуючых жанчын на прадпрыемствах і ў розных установах.

Асаблівая ўвага звяртаецца на водазабеспячэнне працоўных і каналізацыю. Усе раёны горада поўнасцю каналізуюцца. У адпаведнасці з запраектаваным ростам прамысловасці, насельніцтва і ўпарадкаваннем горада—энергетычная база (цеплавая і электрычная) павялічваецца амаль у пяць разоў. Для гэтай мэты намечана пашырэнне існуючай ЦЭЦ і пабудова новай.

Праектам прадугледжаны вялікія работы па азеляненню горада. Горад будзе з усіх бакоў абкружан зялёнымі насаджэннямі. Прамысловыя прадпрыемствы аддзяляюцца ад жыллёвых раёнаў спецыяльнымі зялёнымі абарончымі зонамі шырыней ад 100 да 500 метраў. Акрамя раённых паркаў плошчаю ў 30 гектараў па гораду раскінецца сетка зялёных насаджэнняў—садоў і сквераў, якія зоймуць 270 гектараў плошчы.

Рэканструкцыя і пабудова новых буйных прадпрыемстваў, стварэнне на базе мясцовага паліва (торфа) буйнай базы электрацеплавой энергіі для прамысловых і бытавых патрэб, шырокае развіццё ўнутрыгарадскога транспарта, стварэнне воднай магістралі ў горадзе, карэнная рэканструкцыя водазабеспячэння, пашырэнне і палепшанне жыллёвага фонда—усё гэта падыме Менск да ўзорнай сталіцы перадавой рэспублікі Совецкага Саюза.

Пройдзе некалькі год і Менск рукою і воляю бальшэвікоў ператворыцца ў вялікі квітнеючы соцыялістычны горад. Усё гэта не мара, не фантазія, а сапраўднасць заўтрашняга дня, які так акрэслена відаць у сённяшнім дні.

Райскі

# Работніцы Кітая ў барацьбе за савецкі Кітай

Працоўныя жанчыны Савецкага Кітая прымаюць актыўны ўдзел у вайне за вызвалены Кітай і з энтузіязмам клапоцяцца аб росце і ўмацаванні Чырвонай арміі Кітая.

Работніцы правінцыі Гінкуос'ен (Кіянскі) на кангрэсе работніц і сялянак абавязаліся навербаваць 500 новых чырвонаармейцаў на працягу двух месяцаў, а навербавалі за адзін месяц на 60 чалавек больш.

Для рэвалюцыйнай барацьбы неабходны сродкі— гэта разумеюць працоўныя, яны лічаць больш карысным недаядаць і збіраць грошы на дапамогу сваім советам, чымся трапіць пад ярмо капіталістаў.

Матэрыяльную дапамогу Чырвонай арміі Кітая робяць не толькі рабочыя і работніцы Савецкага Кітая, а таксама працоўныя з белага Кітая.

Працоўныя правінцыі Гонан сабралі сродкі на самалёт для Чырвонай арміі. Рабочыя і работніцы шоўкавай фабрыкі зрабілі вялікі сцяг з чырвонага шоўка ў падарунак Чырвонай арміі. На сцягу было напісана: „Будзьце рэволюцыйны".

У цэнтральным Савецкім раёне Кітая нядаўна было праведзена вялікае свята арганізацыі новай часці Чырвонай кітайскай арміі.

(З кітайскага эсперанцкага бюлетэня).

# „Рацыяналізацыя" швейнай прамысловасці Англіі

(Ліст рабочага Англіі).

„У нас на фабрыцы гатовага адзення праводзіцца шалёная эксплаатацыя, асабліва жанчынработніц.

Устаноўлен нядаўна новы канвеер на фабрыцы гатовага адзення, якіператварае работніц у машыны.

Канвеер абслугоўваюць 19 работніц. Кожная работніца на працягу адной гадзіны выконвае 40 заданняў. Калі якая-небудзь з работніц не можа так хутка працаваць—вылічваюць з пенсіі ўсіх работніц.

Капіталісты крычаць аб „рацыяналізацыі", але гэта „рацыяналізацыя" пабудавана на метадах патагоншчыны для рабочых і вялікіх прыбыткаў для капіталістаў.

На працягу тыдня 19 работніц выпускаюць 2.000 панталон. Раней існаваўшая паштучная аплата была выгадней для работніц, але „рацыяналізацыя" пайшла далей. Знішчана паштучная аплата, а ўстаноўленая выпрацоўка не змяншаючы выпускаемую колькасць прадукцыі, зніжае зарплату работніцам гэтай фабрыкі.

Работніца працаваўшая раней паштучна атрымлівала 4 фунта (каля 20 руб.) стэрлінгаў у тыдзень, цяпер аплата ўстаноўлена $32^1/_2$ шылінга ў тыдзень (каля 8 руб.). Умовы працы жудасныя. Нават найбольш здаровыя работніцы хутка робяцца інвалідамі".

Н'юбіггін (Англія).



Лонданскія піонеры на дэманстрацыі.

# Факт, аб якім прымушана гаварыць буржуазная прэса

„Кур'ер Віленскі" ад 2-3/IX—34 г. змяшчае артыкул свайго карэспандэнта, які апісвае становішча беспрацоўных жанчын, што начуюць у жаночым начлежным доме ў горадзе Вільно.

Аўтар піша: „Палову пакоя займаюць шырокія нары, яны цягнуцца праз усё памяшканне, пакідаючы толькі вузкі праход.

У пакоі знаходзіцца вялікі ўмывальнік. Вокны ў памяшканні адчынены насцеж, але не гледзячы на гэта ў памяшканні невыносная духата і смурод ад выпарэння брудных цел і бялізны і перапоўненых памяшканняў да адказу. Некаторыя жанчыны на нарах зашываюць свае лахманы, многія з тых, што начуюць, не маюць пасцелі і спяць на голай падлозе. Дзеці спяць разам з жанчынамі. Худая, падобная на труп жанчына ледзь сядзіць на нарах і каля яе пяцігадовая дзяўчынка. Падыходжу бліжэй і падаю дзяўчынцы цукерак, дзяўчынка баючыся ўзяла іх з маіх рук і не ведае што з імі рабіць.

— Пакладзі цукерку ў рот—кажа ёй маці.

— Мама, я не буду есці шкла,—адказвае дзяўчынка і аддае маці цукеркі.

Дзяўчынка цукеркі палічыла за шкло.—Няўжо яна ніколі не ела цукерак,—пытаюся я ў маці.

— Не,—адказвае маці і тут-ж адвярнуўшыся заплакала.

Заходжу ў пакой для беспрацоўнай інтэлігенцыі. Сёння іх начуе 6—дзве настаўніцы, фельчарыца, вучаніца гандлёвай школы і дзве канторшчыцы.

З жахам расказвае фельчарыца. У часе вайны яна працавала сястрой, пасля займалася прыватнай практыкай. Цяпер страціла ўсякую надзею на атрыманне якой-небудзь работы па прафесіі. Я жадаю працаваць. Мне сорамна. Вы толькі падумайце, для таго каб не памерці з голаду я прадаю на вуліцы газеты,—канкурырую з малымі дзецьмі".

П.

Ільля ГУРСКІ

# МАЦІ*)

(*Урывак з п'есы*)

Сцэна I

Хата батрака Грышкі.

Грышчыха (*над калыскай, спявае*)

„...Схавайся ты, дзетка, на сваю пасцельку.
Няхай твае вочкі заплюснуць на векі,—
Не ўбачыш ты гора, гора мужыкова,
Не ўзнаеш ты долі, кроўкай палітае..."

Яворскі (*увайшоўшы*). Прышоў паведаміць загад пана Дзеразы, ён такі: „На працягу аднаго дня Грышчыху выселіць з хаты, старэйшага хлапчука, Васіля, заставіць слугою".

Грышчыха. Завошта-ж гэта такая няміласць?

Яворскі. Яна не ведае, ай-я-яй!..

Грышчыха (*калышучы дзіця*). Дрэнь, дачушка, справы...

Яворскі. Куды-ж Грышка падаўся?

Грышчыха. У Піцер. На дарогу ледзь сабралі, а там—бог бацька.

Яворскі. Ну, а сама куды?

Грышчыха. На ўсе чатыры... (*у роспачы*). Вось толькі дзіця малое...

Яворскі. А дзе-ж хлапчук Андрэй?

Грышчыха. Паехаў з бацькам хлеб зарабляць. З маленства, дзеткі, гаруе.

Яворскі. Залатыя рукі ў твайго Грышкі, ды характар чортаў. Што-б было перапрасіць пана. Вінтрас вялікі! Гавэнда!

Грышчыха. О, не-е! Не такая натура.

Яворскі. Гонар мае! А гонар мужыку шкодзіць... Прыдзецца класці зубы на паліцу.

Грышчыха. Касцьмі зляжа, ды не падасца.

Яворскі. Нідзе дзенецца. Гавэнда!

Грышчыха (*калышучы дзіця спявае*).

„Схавайся ты, дзетка, на сваю пасцельку.
Няхай твае вочкі заплюснуць на векі,—
Не ўбачыш ты гора, гора мужыкова,
Не ўзнаеш ты долі, кроўкай палітае..."

Яворскі. Гавэнда! (*Тузае за плечы*). Ог, як скалану, то богу душу аддасі.

Грышчыха. Скалані вярбу, там грушы растуць... (*закрывілася ад болю*). Ог-жа ўсадзіў бог душу, нібы ў пень... (*Вырываецца*). Адчапіся, назола, а то ў вочы плюну!

Яворскі. Гавэнда! (*Выкідвае праз вакно рэчы*). Век будзеш помніць мяне.

Грышчыха. Ды ўжо-ж, не забудуся...

Дзераза (*праходзячы ля вакна*). А гэта маладзіца яшчэ тут.

Яворскі. Яе ніяк не выпхнуць.

Дзераза. Як так! (*Уваходзячы*). Ты што-ж гэта, па этапу хочаш?

Грышчыха. Бронь-божа, лепей самой. За такую ласку дзякуй.

Дзераза. Цэ, цэ. Не-е-ма на цябе майго ціваюна, ён-бы скора выгнаў гэты дур з галавы.

Яворскі (*моцна ўдарыў стэкам*). Маўчы! Гавэнда!

Дзераза. Па зубах! Во, так! Во, во!

Грышчыха (*да Дзеразы*). Паночку, няўжо-ж гэта за тое, што вашу Стасю сваімі грудзьмі выкарміла. А божухна ты мой, што-ж гэта за напасць да нас прышла. Звяр'ё, чаго вам трэба ад мяне. І калі на вас пагібель прыдзе. А-ай! Аё-я-ёй! А-а-ай!

Дзераза. Бунтарка! (*б'е*). Цэ, цэ.

Яворскі (*б'ючы*). Сціхні!

Грышчыха (*залілася кроўю*). Дзякую вас, паночку, за вашу ласку. (*Дастае выбіты зуб*). Век буду вас помніць, пастараюся, каб і дзеці не забыліся, а як дасць бог унукаў, то і ім раскажу, што значыць быць у няласцы ў пана.

Бахрым (*увайшоўшы*). Што гэта? (*Паднімае Грышчыху*). Вы ўся ў крыві? (*Глядзіць то на Яворскага, то на Дзеразу*). Э-эх, гахнуць-бы!

Грышчыха. Ігнаська, дзеткі, не трэба. Барані божа... З свету зжывуць.

Яворскі (*напуджаны*). У Сібір...

Бахрым. Што-о?

Яворскі (*напуджана*). Гэта пан Дзераза загадалі. Яны і зуб выбілі. Вінтэрас...

Бахрым (*злосна*). Сыйдзі з маіх вачэй. (*Замахнуўся*). А то, як-бы, не лёг грэх на маю душу.

Дзераза. Ого-го! У Сібір! (*Хутка выходзіць, а за ім Яворскі*).

Грышчыха (*напалохана*). У Сібір?

Бахрым (*цяжка уздыхнуўшы*). Дрэнныя паперы... Эх-ха-ха. Няўжо ўвесь век так будзем жыць. (*Грышчыха бярэ дзіця, Бахрым рэчы, яны моўчкі выходзяць*).

---

*) Беларускі пісьменнік Ільля Гурскі напісаў новую п'есу пад назвай „Маці", якая ў хуткім часе будзе ставіцца беларускімі тэатрамі. Урывак, які надрукован намі, паказвае вобраз маці-сялянкі часоў прыгона. Панскія пыганятыя, якія мелі неабмежаваныя правы над прыгоннымі сялянамі, распараджаліся іхным жыццём і смерцю па свойму ўгледжанню. Урывак з п'есы Гурскага паказвае адзін з момантаў, калі за невыплату падатка жудасна збяднелая сям'я селяніна выкідваецца са сваёй уласнай хаты.

Рэдакцыя

# Аб падрыхтоўцы жывёлагадоўчых соўгасаў і калгасных жывёлагадоўчых ферм да зімоўкі жывёлы

## Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб жывёлагадоўлі, безумоўны рост арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і іх большэвізацыя, павышэнне актыўнасці калгаснікаў і беражлівых адносін да калгаснай маемасці, урэшце здавальняючы ўраджай хлеба, траў і кораньплодаў ствараюць усе ўмовы для добрай падрыхтоўкі і правядзення зімоўкі жывёлы ў гэтым годзе ў БССР. Аднак да гэтага часу яшчэ рад партарганізацый калгасаў і соўгасаў поўнасцю на падрыхтоўку жывёлагадоўчых ферм да зімы не пераключыліся, многія райкомы, райвыканкомы, і асабліва Ельскага, Дрысенскага, Заслаўскага, Лепельскага, Расонскага і іншых раёнаў, шчыльна да кіраўніцтва гэтым важнейшым мерапрыемствам не падышлі.

Зусім нездальняюча ідзе падрыхтоўка да зімы і ў соўгасах. Так соўгасы Менскага свінаводтрэста рамонт і перадзелку свінарнікаў на 15 жніўня выканалі толькі на 21,5 проц. Будаўніцтва новых свінарнікаў на 50 проц., канюшні—на 66,5 проц. Такое-ж становішча і па другіх трэстах сістэмы Наркомсоўгасаў.

Бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што РК партыі, РВК, палітаддзелы МТС і соўгасаў, зямельныя органы і соўгастрэсты павінны на працягу бліжэйшых дзён так перабудаваць сваю работу, каб у справу захавання дарослага пагалоўя і маладняка, яго ўпітанасці, забяспечэння кармамі, цёплымі, прадэзінфекаванымі памяшканнямі і добрым доглядам былі ўцягнуты ўсе партарганізацыі соўгасаў і калгасаў, кожны асобны партыец і кожны калгаснік і калгасніца. Для гэтага ЦК прапануе:

1. ГК і РК, палітаддзелам МТС і соўгасаў арганізаваць праверку работы асобных партарганізацый калгасаў, соўгасаў па кіраўніцтву справай жывёлагадоўлі і падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы калгасных і соўгасных ферм.

2. Заслухаць на бліжэйшых пасяджэннях бюро РК аб стане асобных ферм і кіраўніцтве зямельных органаў справай падрыхтоўкі да зімоўкі ферм.

3. З 15 верасня па 1 кастрычніка па ўсіх раёнах правесці масавы агляд стану жывёлагадоўчых ферм калгасаў і з 1 па 15 кастрычніка злёты загадчыкаў лепшых калгасных ферм з шырокім удзелам даярак, цялятніц, пастухоў, конюхаў і т. д. Прапанаваць сакратарам райкомаў і начальнікам палітаддзелаў МТС разгарнуць падрыхтоўчую работу да злётаў. Арганізаваць соцспаборніцтва на лепшую ферму.

4. У канцы кастрычніка правесці ўсебеларускі злёт лепшых жывёлагадоўчых ферм рэспублікі з удзелам калгаснікаў-ударнікаў жывёлагадоўлі і спецыялістаў.

5. Даручыць Наркамзему і ЦП саюза МТС і батракоў правесці ў Менску, Гомелі, Віцебску і Магілеве міжраённыя канферэнцыі зоаветспецыялістаў і нам. нач. райза па жывёлагадоўлі з пастаноўкай пытанняў аб падрыхтоўцы да зімы, захаванні маладняка і арганізацыі зоатэхвучобы. Даручыць райкомам партыі прыняць актыўны ўдзел у рабоце раённых вытворчых нарад спецыялістаў, праводзімых Наркамземам на працягу верасня месяца.

6. Прапанаваць рэдакцыям газет „Звязда“, „Рабочий“, „Калгаснік Беларусі“ і інш., а таксама ўсім раённым і палітаддзельскім газетам цяпер-жа разгарнуць агляд падрыхтоўкі калгасаў і соўгасаў да зімы, да надыходзячых раённых і ўсебеларускага злётаў.

7. У перыяд з 12 верасня па 1 кастрычніка правесці нараду дырэктароў соўгасаў, начальнікаў палітаддзелаў і парторгаў па пытанню аб падрыхтоўцы да зімоўкі па ўсіх соўгастрэстах.

8. У справе аўладання тэхнікай жывёлагадоўлі і масавага разгортвання зоаветтэхвучобы даручыць БІМЗО, Наркамзему, Упаўнаркомсоўгасаў на працягу дэкады распрацаваць мерапрыемствы па арганізацыі сеткі гурткоў, завочнай вучобы, сістэматычных кансультацый, а таксама выданне неабходнай літаратуры, даведнікаў і серыі красачных зоаветплакатаў, забяспечыўшы імі кожную калгасную і соўгасную ферму.

9. Абавязаваць дырэктароў свінавод-і малакопрамтрэстаў, а таксама ўсіх дырэктароў соўгасаў і начальнікаў палітаддзелаў забяспечыць сканчэнне рамонтаў кароўнікаў, свінарнікаў і т. д., іх ацэпленне і дэзінфекцыю не пазней 10 кастрычніка.

Даручыць Наркамзему распрацаваць на працягу дэкады рад мерапрыемстваў, забяспечваючых сканчэнне рамонту і новага будаўніцтва скотных двароў к устаноўленаму тэрміну. Прапанаваць РК, РВК і райза не пазней 20 верасня закончыць складанне кармовых балансаў па кожнаму калгасу, прадугледзеўшы такое размеркаванне кармоў, каб імі была таксама забяспечана жывёла, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў.

Звярнуць асаблівую ўвагу на пастаноўку ўліку і норм выдачы кармоў, увядзенне здзельшчыны і прэміяльнай аплаты.

10. Улічваючы, што ў асенняе разводдзе большая частка соўгасаў бывае адрэзана ад снабжаючых і базісных цэнтраў, абавязаць т. Жолудава сумесна з дырэктарамі трэстаў на працягу дэкады распрацаваць рад мерапрыемстваў, забяспечваючых завоз у гэтыя соўгасы неабходнай колькасці кармоў мінімум на 3 месяцы. Апрача таго, да пачатку разводдзя завесці ў гэтыя соўгасы ўсе астатнія запланаваныя матэрыялы.

11. Даручыць сельгасаддзелу ЦК устанавіць сістэматычную праверку выканання данай пастановы.

# ПАДРЫХТАВАЦЬ ЖЫВЁЛЕ ДОБРУЮ ЗІМОЎКУ

Уздыму жывёлагадоўлі Совецкага Саюза партыя надае асаблівую ўвагу. Развіццё жывёлагадоўлі накіравана па тэй-жа лініі, па якой ідзе ў асноўным развіццё зернавой галіны сельскай гаспадаркі, гэта значыць, па лініі буйных, калектыўных малочна-таварных ферм.

Уздым і палепшанне работы жывёлагадоўчых калгасна-таварных ферм цесна звязана з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваннем калгасаў. Зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі з'яўляецца першапачатковай задачай усяго калгаснага будаўніцтва і ў гэтым сэнсе жывёлагадоўчая калгасна-таварная ферма з'яўляецца яго неадрыўнай часткай.

Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы фермы да зімоўкі павінна мабілізаваць усе парт-арганізацыі соўгасаў і калгасаў, усіх калгаснікаў і калгасніц на добрую падрыхтоўку да зімоўкі жывёлы, на захаванне дарослага пагалоўя і маладняка, яго ўкормленасці, забяспечанасці кармамі, цёплымі прадэзінфекаванымі памяшканнямі. Падрыхтоўка памяшканняў да зімы мае асабліва важнае значэнне.

Рыхтаваць памяшканні да зімы трэба наступным чынам: сцены цялятнікаў, кароўнікаў, свінарнікаў і стайняў у першую чаргу неабходна заканапаціць, пазабіваць дзіркі, а таксама агледзіць вокны і дзверы. Памяшканні павінны быць прадэзінфекаваны, а вакол іх зроблены канавы для стока вады. Сцены цялятнікаў для папярэджання захворванняў заўсёды беляцца хлорыстай вапнай. Перш чым паставіць жывёлу на зімоўку, трэба правесці поўны ветэрынарна-зоатэхнічны агляд пагалоўя, з мэтай ізаляваць хворую жывёлу ад здаровай.

За падрыхтоўкай памяшканняў для жывёлы трэба асабліва сачыць, бо гэта з'яўляецца адным з момантаў, які спрые лепшаму росту і ўкормленасці жывёлы.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на абсталяванне скотнага двара і цялятніка. Да перахода на стойлавае ўтрыманне жывёлы трэба падрыхтаваць увесь інвентар—кармушкі, прывязі, бідоны, вёдры, вілы, граблі і т. д.

Не пазней 20-га верасня трэба скончыць складанне кармавых балансаў і рацыёнаў па ўсіх калгасах. Кармавыя балансы трэба прапрацаваць на вытворчых нарадах жывёлагадоўчых ферм.

Ужо ўстаноўлена, што індывідуальная здзельшчына на жывёлагадоўчых калгасна-таварных фермах апраўдала сябе, як форма аплаты працы, спрыючая лепшай рабоце. Таму трэба канчаткова ўстанавіць штаты фермы і ўвесці індывідуальную здзельшчыну кожнага члена брыгады жывёлагадоўчага цэха.

Укамплектаванне брыгад павінна быць праведзена за лік лепшых, правераных калгаснікаў і калгасніц, якія адданы гэтай справе і любяць яе.

Усю работу фермы па пераводу на зімоўку трэба праводзіць ужо апраўдаўшым сябе метадам, на аснове ўдарніцтва і соцспаборніцтва. З пераводам на стойлавае ўтрыманне жывёлы неабходна праверыць соцдагаворы паміж фермамі, асобнымі даяркамі і даглядчыцамі, і заключыць новыя ўмовы з пунктамі, якія прыстасаваны да работы ў зімовы час.

Кожнаму работніку жывёлагадоўчай калгасна-таварнай фермы трэба памятаць, што справа залежыць ад нас саміх, і ад нашай сумленнай работы. Чым лепш будуць працаваць даяркі, даглядчыцы—тым лепш будзе пастаўлена работа на ферме, тым больш жывёлагадоўчай прадукцыі будзе мець калгас і ўся краіна ў цэлым.

„... Калі ўсе калгаснікі—усе, а не толькі большасць—будуць працаваць сумленна, калгасы заваляцца прадуктамі, яны заваляцца розным дабром і наша краіна стане самай багатай у свеце".

Манахава
Раскіна.

# Завяршылі бульбапастаўкі

Калгасніцы калгаса „Чырвоны парамоннік", Слуцкай МТС у гонар дзесяцігоддзя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі" арганізавалі абоз з бульбай імя журнала. Арганізацыяй абоза калгас завяршыў бульбаздачу дзяржаве. Усяго здадзена 31 тона бульбы. Весці бульбу абозам было даручана лепшым калгасніцам-ударніцам: Мызнік, Бруй, Майко, Вагунцэвіч, а ўсяго ў абозе ўдзельнічала 18 лепшых калгасніц.

Кучур.

---

**Стварыць на зіму добрае, цёплае памяшканне, забяспечыць жывёлу кармамі, захаваць увесь маладняк — вось баявая задача жывёлагадоўчых калгасна-таварных ферм**

# Вопыт работы МТФ імя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“



Селіцкая Марыля цялятніца-ўдарніца к-са „Ніва Окцябра“.

Малочна-таварная ферма „Ніва Окцябра“, Рагачоўскага раёна, за пяць год свайго існавання вырасла выключна за лік свайго прыплоду. Калі раней ферма мела каля 43 галоў жывёлы, то на сёнешні дзень яна налічвае больш за 197 галоў. За ўвесь час свайго існавання ферма мае ў графе падзежа толькі трох цёлак, ды і то не па віне даглядчыц. Тут мы бачым работу выключна адданых справе калгасніц-даярак, даглядчыц і цялятніц, якія сумленна выконваюць сваю справу. Ферма ганарыцца сваімі даяркамі, цялятніцамі, якія маюць шматгадовы стаж работы на ферме. Ударніцы Каліноўская Дуня і Селіцкая Марыля працуюць на ферме пяць год і паказалі сапраўдныя ўзоры ўдарнай работы.

На ферме працуе ўсяго 13 чалавек—пяць даярак, дзве цялятніцы, пяць пастухоў і загадчык фермы. Усе пераведзены на здзельную аплату і працадні налічваюцца ад прыроста прадукцыі, удойнасці, ацёлу, злучкі і т. д. Усе работнікі фермы спаборнічаюць паміж сабой і выклікалі на соцспаборніцтва ферму калгаса „Ленінскае жыццё“. На нарадзе, якая адбылася 10 верасня, прысвечанай уключэнню ва ўсебеларускі конкурс на лепшую даярку, ферма надала сабе імя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“.

— У зімовы час жывёлу кормім тры разы на дзень, цвёрда прытрымліваючыся ўстаноўленых норм кармлення. Корм жывёле даецца кожнай паасобку ў залежнасці ад яе вагі. Раніцой карова атрымлівае сена змешанай з саломай, у дзень—караньплоды, або сілос з гуменнымі адкідамі, а ўвечары — салому. Пояцца каровы два разы на дзень.

Цялят мы кормім такі уноўнароджаных выпойваем чыстым малаком ад маткі да 16-дзённага ўзросту па тры разы ў дзень. Паступова цялят пераводзім на мешаніну (малако з перагонам), якою кормім таксама на працягу 16 дзён. З 32-дзённага ўзросту цяляці даецца пойла з мешанінай малака, перагону і канцэнтратаў. Сена атрымліваюць цялята ўволю ўвесь час.

Наша ферма ўжо выканала і нават перавыканала мясапастаўкі. Па плану ферма павінна была здаць $22^1/_2$ цэнтнеры, а здана 31,66 цэнтн. Лішак здадзенага мяса залічан за свінагадоўчай фермай. Малакапастаўкі выканаы на 73 проц.

Тормазам у развіцці жывёлагадоўлі калгаса з'яўляецца тое, што калгас не мае дастатковай пашы для такой колькасці жывёлы. Гэтым часткова тлумачыцца малаўдойлівасць і недавыкананне малакапаставак.

Зараз перад праўленнем калгаса і палітаддзелам МТС паставулена пытанне аб пашырэнні выпасаў альбо разбуйненні фермы. Спадзяемся, што ў бліжэйшыя часы пытанне будзе вырашана.

Загадчык фермы Хаткевіч. Даяркі: Каліноўская Д., Драздоўская М., Хаткевіч Н., Каліноўская К.

Рагачоўскі раён.



Хаткевіч Наталля—даярка к-са „Ніва Окцябра“.

# ЛЕПШАЯ З ЛЕПШЫХ

Не па-вераснёўску свяціла і грэла сонейка. Лёгкі ветрык шасцеў лістамі дрэў і разносіў свежы прыемны пах сена. Пчолкі, як улетку гудзелі, шукаючы сабе здабычы. Велізарныя вазы з бульбай, што абозамі цягнуліся па дарозе, шчаціністыя іржышчы палёў і свежаўзараная пад зяб глеба сведчылі аб набліжэнні восені.

Калгас „Ніва Окцябра“, Рагачоўскага раёна, падводзіў вынікі сельска-гаспадарчага года. Прыблізна ўжо было вядома, што за працадзень калгаснікі сёлета атрымаюць значна больш, чым у мінулым годзе. Сёлета і ўраджай большы і калгас значна пабольшаў, таму што ў калгасную сям'ю прыбыло шмат новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Яны пакінулі аднаасобнае жыццё і прышлі ў калгасную сям'ю, каб агульнымі сіламі змагацца за заможнае, культурнае калгаснае жыццё. Яны ўпэўніліся на сабе і бачаць, што іншай дарогі да шчаслівага заможнага жыцця няма.

І сапраўды, паглядзець толькі як добра жыве ў калгасе былая бядначка Дуня Каліноўская. Сапраўдным заможным жыццём жыве яна зараз у калгасе. Аб гэтым сведчыць Дуніна хата, Дуніна вопратка, добра апранутыя дзеці, яе швейная машына, гадзіннік, фіранкі на вокнах, бялюткія крамныя навалачкі, венскія крэслы, кветкі і нейкая асаблівая чыстата ў хаце.

У гэтай прыемнай абстаноўцы ў хаце Дуні сабраліся сёння ўсе даяркі фермы „Ніва Окцябра“.

# НЯМА больш пасёлка „Воўчай гары"— ёсць калгас імя Красіна

*(Ліст новаўступіўшых калгасніц калгаса імя Красіна, зоны Цялушскай МТС, Бабруйскага раёна).*

Да вас працоўных аднаасобніц Бабруйскага раёна зварачваемся мы, былыя аднаасобніцы пасёлку „Воўчай гары". Не бачылі мы жанчыны-сялянкі радасці ў аднаасобным жыцці. Працавалі мы болей за нашых мужчын—працавалі ў полі, працавалі ў хаце, глядзелі за дзецьмі, а гаспадарамі над усім былі заўсёды мужчыны.

Нарэшце ўбачылі мы самі, што лепш за нас жывуць калгасніцы. Працуючы ў калгасе і зарабляючы працадні, яны зрабіліся поўнапраўнымі гаспадарамі ў сваіх сем'ях. Радасна глядзець на іхняе заможнае жыццё.

Вось сям'я калгасніцы Манько Тэклі выпрацавала ў мінулым годзе 1100 працадзён і атрымала 121 пуд збожжа, 500 пудоў бульбы, 380 пудоў кораньплодаў і 400 руб. грашыма.

Таксама сям'я калгасніцы Шмыгун Веры, выпрацавала 700 працадзён, атрымала 78 пудоў збожжа, 320 пудоў бульбы, 120 пудоў кораньплодаў і 260 руб. грашыма.

А мы сядзелі і глядзелі на свае палоскі і чакалі таму, што кулак нашэптваў „пачакаць". Нарэшце ўсё-ж перамаглі хістанні і ўступілі ў калгас.

І вось няма больш пасёлка „Воўчай гары", на яго месцы ўзрос наш малады калгас імя Красіна,

Ударна мы працуем зараз у калгасе, працуем так, як вучыў наш вялікі правадыр тав. Сталін.

І ўсім аднаасобнікам мы раім так зрабіць. Даволі чакаць!

Даволі цёмнага, бязрадаснага аднаасобнага жыцця! Смялей жанчыны ўступайце ў калгасы!

Давайце разам з намі ўсімі калгасніцамі і калгаснікамі ў калгасах змагацца за заможнае жыццё — за бальшэвіцкія калгасы.

Па даручэнню новаўступіўшых калгаса імя Красіна: Манько Алена, Берасцень Надзя, Юшкевіч Алена, Берасцень Ніна, Манько Еўдакія, Юшкевіч Мар'я.

---

## ЛЕПШАЯ З ЛЕПШЫХ *(канец)*

Тут і цялятніцы, якія жадаюць паслухаць пра дзесяцігадовы юбілей журнала „Работніца і калгасніца Беларусі", жадаюць пабыць на нарадзе фермы па ўключэнню ў конкурс на лепшую даярку.

Хата Дуні перапоўнена. Калгасніцы ўважліва слухаюць аб рабоце журнала „Работніца і калгасніца Беларусі", яны з цікавасцю разглядаюць малюнкі, заслухоўваюць вытрымкі. І калі нарада даярак азнаёмілася з планам святкавання юбілею, Дуня Каліноўская ўносіць прапанову назваць ферму імем журнала „Работніца і калгасніца Беларусі".

Гэтая прапанова парушае агульную цішыню нарады. Калгасніцы загаварылі, кожнай хацелася нешта выказаць, дадаць. „Мы яшчэ лепш будзем цяпер працаваць",—выказваецца даярка Кацця. „Пастараемся апраўдаць ганаровае імя,—дадае Наталя,— трэба толькі, каб журнал трымаў з намі цесную сувязь". Думкі нарады яднаюцца ў адну. Рукі аднагалосна ўзнімаюцца ўгару за назву фермы імем журнала „Работніца і калгасніца Беларусі", за калектыўную падпіску на журнал, за лепшую работу на ферме.

Тут-жа нарада ўключаецца ў конкурс абвешчаны НКЗ на лепшую даярку. Дуня першай выказываецца за ўключэнне ў конкурс і барацьбу за першынства. Па яе рухах і бляску вачэй відно, што яна не будзе апошняй у гэтым спаборніцтве. У гэтым упэўнены і загадчык фермы і даяркі.

— Чым-жа Дуня лепш за другіх? Яна працуе лепш і больш. Да Дуні прымацавана 18 дойных кароў і яна поўнасцю спраўляецца са сваёй работай. За пяць год Дунінай работы не было ніводнага выпадку падзяжу маладняка. Яна даглядае цёлак да пяцідзённага ўзросту, потым некалькі дзён поіць малаком ад маткі. Калі цёлачка памацнее, яна накіроўваецца ў агульны цялятнік.

— Колькі я іх выхадзіла,— кажа Дуня, — нянчылася, як са сваімі дзеткамі. За пяць год маёй работы ферма вырасла з 43 галоў да 197 выключна са свайго прыплода, і кожная цёлка ведае мяне, памятае мае рукі.

Дуня працуе заўсёды на больш адказных і цяжкіх участках работы. Калі карова бадлівая, альбо цяжка дае малако, туды заўсёды ідзе Дуня і выконвае свае абавязкі.

Аб Дуні Каліноўскай можна смела сказаць, што яна з'яўляецца лепшай з лепшых на ўсёй ферме. За паўгода сваёй работы яна мае 246 працадзён, не гледзячы на тое, што ў гэты час карысталася двухтыднёвым адпачынкам.

Дуня ідзе першай па спаборніцтву паміж даяркамі. Яна выклікала на спаборніцтва Хацкевіч Наталлю і першынство зразумела застаецца за Дуняй.

Гледзячы на работу Дуні Каліноўскай міжвольна ўсплывае думка—болей-бы такіх працаўніц, болей-бы такіх ударніц, з якімі можна будаваць і будуецца заможнае, культурнае калгаснае жыццё.

**Раскіна.**

Рагачоўскі раён.



Каліноўская Дуня — лепшая ўдарніца даярка калг. „Ніва Окцябра".

# Свінаркі Лёня і Вера поўнасцю захавалі апарос

У канцыляры калгаса сабралася каля дзесятка калгаснікаў. Кожны прышоў па сваёй справе. Каля рахункавода калгасніца Барталевіч падпісвае ўмову аб здачы цяляці калгасу.

З другога боку стаяць двое дзяўчат. Адна з іх крыху жвавейшая, з бусамі на шыі, не вытрымала і прагаварыла.

— Хутчэй ты, хутчэй...

— Што гэта за дзяўчаткі,—звярнуўся я да старшыні калгаса Бокуня.

— Гэта-ж нашыя лепшыя ўдарніцы—свінаркі Радкевіч Лёня і Лукашэвіч Вера,—адказаў задаволены старшыня калгаса і павярнуўся да іх.

— А што ў вас за справа?—запытаўся я ў свінарак.

— Ёсць справа... Вось прышлі „зарэгістрыраваць" народжаных,— смяючыся разам адказалі свінаркі.

Падыходзім да свінарніка. Свінарнік вялікі—на 200 свіней.

Заходзім у першую палову свінарніка. Усюды гаспадарскі парадак, станкі чыстыя, пабеленыя, падлога таксама чыстая і сухая. Усе свінні сытыя і чыстыя. Пад'еўшы, яны бестурботна ляжаць на сухой свежай саломе.

Вачам не верыцца, што гэта падсосныя свінаматкі, здаецца, што тут адкормачны цэх—какія сытыя свінні, а парасяты—гладкія, белыя, як гарбузікі.

Лёня і Вера ненахваляцца сваімі выхаванцамі:

— Вось, паглядзіце, трынаццаць парасятак і ад адной свінаматкі. А вось сама матка. У яе толькі адзінаццаць саскоў. Каб выгадаваць усіх парасят, прышлося трох адняць і прыпусціць да другой маткі, якая прывяла 9 парасят. Спачатку гэта свінаматка не дапускала чужых парасят. Тады ветфельчар Пракоф'яў параіў, каб іх крыху змазалі рыб'ім тлушчам. Так мы і зрабілі. Свінаматка не разабрала якія свае, а якія прыпушчаныя парасяты і пачала ўсіх карміць.

Мы вельмі ўважліва даглядаем парасят, не дапускаем ніводнага адыходу. Быў выпадак—прапала адно парасё, але не па нашай віне. Пастушок стукнуў парасё і атрымаўся заварот кішок.

Восем месяцаў, як мы сталі даглядчыцамі свіней. Тады было толькі дзесяць свінаматак, а зараз—75 штук свінапагалоўя. Яшчэ маем паросных матак. План на гэты год перавыканалі.

Зараз на ферме ёсць 2 кныры палепшанай пароды. Стада ўсё больш павялічваецца.

— Раскажыце, чаму ў вас такія гладкія свінні і як вы ўдвух спраўляецеся іх даглядаць,—перабіў я свінарак.

— Ну, як сказаць? Мы, проста, любім сваю справу. Уважліва даглядаем, вывучаем свінаматку, ведаем асаблівасць кожнай.

Кормім 4 разы на дзень, але не ўсіх і неаднолькава, а ў залежнасці ад патрэбнасці. Парасятам даем бульбу, свінням—рэзанае мясіва з вадой: свінні наядаюцца і напіваюцца. На падножны корм свіней выганяем з самай раніцы. Днём прыганяем дамоў, поім, свінні адпачываюць у цяньку, а пасля зноў на полі да самага вечара.

Пасля кармлення заўсёды чыста выціраем кармушкі і прасушваем на сонцы а праз дзень вымываем цёплай вадой.

Свінарнік трымаем у чыстаце, не дапускаем макраты, падсцілаем кожны дзень свежай саломай і раз у тыдзень вымываем станкі. Вось чаму ў нас свінні здаровыя, чыстыя і спраўныя. Нам і працадні налічваюць у залежнасці ад прыроста свіного пагалоўя і ўпітанасці.

У час зімовага догляду нам дадуць яшчэ аднаго даглядчыка. З работай справімся—усё будзе добра, будзьце упэўнены,—радасна засмяяўшыся, закончылі свае апавяданні свінаркі.

Глядзіш на жыццярадасных, энергічных ударніц—свінарак і дзівішся. Вось што значыць любіць сваю справу, ведаць сваю тэхніку і працаваць добрасумленна. Усё залежыць ад людзей, ад іх адносін да работы. Радкевіч Лёня і Лукашэвіч Вера поўнасцю захавалі апарос, у той час, як у суседніх свінафермах пры аднолькавых умовах ёсць адыход парасят ад 8 да 70 проц.

Калгас „13-годдзе Окцябрскай рэвалюцыі", Целякоўскі сельсовет, Узлзенскі р.

Ю. Снытко.

# З адстаючай у перадавыя

**Брыгадзір Якубоўская Х.**

(*Калгас імя Варашылава, Тураўскага раёна*)

За дрэннае і несвоечасовае выкананне ўсіх сельскагаспадарчых работ праўленне калгаса ў канцы 1933 сельскагаспадарчага года зняла з брыгады № 2 100 працадзён і пералічыла першай брыгадзе, якая паказала ўзорную работу.

Прычына адставання брыгады заключалася ў тым, што брыгадзір Рай Адам не забяспечыў штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва брыгадай.

Зняўшы брыгадзіра Рая, праўленне занялося пытаннем падрыхтоўкі новых кадраў для кіраўніцтва брыгадай.

У канцы 1933 года праўленне накіравала мяне на курсы брыгадзіраў паляводчых брыгад, арганізаваных пры МТС. Я скончыла курсы не дрэнна і мяне вылучылі брыгадзірам брыгады № 2.

Спачатку было вельмі страшна, не верылася, што я змагу кіраваць мужчынамі, некаторыя нават насміхаліся,—як гэта жанчына будзе кіраваць брыгадай. Але я не спынілася перад гэтымі цяжкасцямі і ў лютым 1934 года прыняла брыгаду.

Прыняўшы брыгаду я адразу пачала рыхтавацца да веснавой сяўбы. Асаблівую ўвагу я аддавала пытанню падрыхтоўкі цягавай сілы да сяўбы, у выніку чаго ўсе 30 коняй вышлі да сяўбы вышэй сярэдняй укормленасці.

У красавіку раённы злёт брыгадзіраў накіраваў мяне на ўсебеларускую вытворчую нараду лепшых паляводчых брыгад. Гэта нарада мне дала шмат карысці ў справе лепшай арганізацыі працы ў брыгадзе. Пасля абвяшчэння ўсебеларускага конкурса на лепшую паляводчую брыгаду, мая брыгада поўнасцю ўключылася ў гэты конкурс. Умовы конкурса былі давядзены да кожнага калгасніка. 46 жанчын і 15 мужчын маёй брыгады былі поўнасцю ахоплены соцспаборніцтвам. Шмат з гэтых людзей паказалі сапраўды ўзорныя прыклады работы (Руневіч М., Швед А., Чэрнушэвіч Ян, Рай Міхась, Швед Арына, Рай Надзя, Чэрнушэвіч Домна, Рай Цэся, Юхневіч Юля). Дзякуючы штодзённай і канкрэтнай дапамозе ў маёй рабоце з боку палітаддзела і аддана̇й работы лепшых калгасніц і калгаснікаў, мая брыгада скончыла веснавую сяўбу 28|IV на „выдатна", за што я як брыгадзір і сем лепшых ударнікаў і ўдарніц маёй брыгады былі палітаддзелам прэміраваны.

Праполачную і ўборачную кампанію мая брыгада правяла добра. Поспех праполачнай і ўборачнай рашала добрая пастаноўка арганізацыі працы. Усе працаздольныя мужчыны і жанчыны былі разбіты на невялічкія звенні. Асаблівая ўвага звярачалася на барацьбу са стратамі. На ўчастках маёй брыгады былі пабудаваны 2 вышкі, з якіх піонеры ахоўвалі наш ураджай, акрамя таго піонеры арганізавалі збор каласоў на палёх.

Калі ў мінулым годзе брыгада №2 значна адставала ў справе павышэння ўраджайнасці, то ў гэтым годзе яна мае зусім адваротны малюнак. Брыгада дабілася ўраджайнасці жыта 13,5 цэнтн. з га, пшаніцы—17,5 цэнтн., ячменя—13 цэнтн., ільносемені—5 цэнтн., гароху—10 цэнтн.

Асеннюю сяўбу правялі з захаваннем усіх агратэхнічных правіл з тым, каб у будучым годзе атрымаць яшчэ больш ураджай. Дзяржаўныя зерняпастаўкі брыгада скончыла поўнасцю яшчэ 20/VIII 1934 года.

Зараз брыгада ўключылася ва ўнутрыраённы конкурс на лепшую апрацоўку ільнопрадукцыі і здачу ільновалакна да 1-га кастрычніка не ніжэй 15-га нумара.

# Хаванне бульбы на зіму

## Хаванне ў спецыяльных хавальніках і падвалах

Яшчэ да загрузкі бульбы хавальнік павінен быць добра абсталяваным, мець засекі ёмкасцю на 15—16 тон, а таксама рашотчатую падлогу, якая ўзнімалася-б над зямлёй на 15—20 сант. Такая падлога неабходна для вентыляцыі. Бульбу трэба насыпаць у засекі адсартаванай, прасушанай, не вышэй 1,5 метра. Дзверы, вокны і люкі на зіму ацяпляюцца матамі, або войлакам, а з надыходам маразоў павінны прыкрывацца гноем. Хавальнік забяспечваецца вентыляцыяй для рэгулявання тэмпературы ў хавальніку і абавязкова тэрмометрамі. Тэмпература ў хавальніку ўвосень павінна прытрымлівацца не вышэй знадворнай, а ўзімку даводзіцца да двух—трох градусаў. Становішча бульбы ў засеках перыядычна правяраецца.

## Хаванне бульбы ў капцох і траншэях

Месца для капцоў і траншэй выбіраецца роўнае, з высокім і глыбокім стаяннем грунтовых вод. Пасля выбара месца — прыступаюць да рыцця катлаванаў. Глыбіня іх робіцца на 20—25 сант. Шырыня на 2 метра і даўжыня ад 15 да 20 мэтраў. Каб забяспечыць працу для выгрузкі і загрузкі, адлегласць паміж капцамі павінна быць у 6—8 метраў. Траншэі робяцца таксама, як і капцы. Шырыня траншэі павінна быць 1—1,5 метра, глыбіня — 0,75 метра, даўжыня 15—20 метраў. Пры капцовым і траншэйным хаванні бульбы неабходна вентыляцыя. Вентыляцыя робіцца адначасова з рыццём катлавана, для чаго на дно канавы або катлавана кладзецца чатырохкантовая труба, памерам у 20—25 сант. Канцы такой трубы не даходзяць да дна капца на паўметра. Да гэтай прадоўжнай трубы прыстаўляюцца вертыкальныя трубы з адлегласцю адна ад другой на 4 метра, вышынёй—на 2 метра. Калі бульба на хаванне ідзе вільготнай, для больш хуткай прасушкі бульбы, неабходна ўжываць наступную вентыляцыю: на дно капца кладзецца чатырохкантовая труба, канцы якой адводзяцца на двор пры дапамозе каленчатых труб. Да гэтай трубы на адлегласці чатырох метраў прыстаўляюцца вертыкальныя трубы вышынёй ад 1,25 да 1,5 метра, у залежнасці ад вышыні нагрузкі. Пасля засыпкі бульбы, уверсе капца на вертыкальныя трубы, якія павінны быць абавязкова прасвідраванымі, кладзецца чатырохкантовая труба, канцы якой адводзяцца на двор. Насыпаецца бульба ў капец роўнай кучай у выглядзе двухбаковага даху, вышынёй ад 1 да 1,25 метра, які добра выроўніваецца і завяршаецца.

Бульба, засыпаная ў траншэю, альбо недасыпаецца да краёў на 15 *см*, альбо выводзіцца верхам у выглядзе двухбаковага даху вышынёй на 25 *см*. Пасля таго, як бульба засыпана, капец ці траншэю ўкрываюць саломай (для накрыцця іржаная салома лічыцца лепшай). Салома кладзецца роўным пластом таўшчынёю ў 50 *см*, які зараз-жа прысыпаецца зямлёй на 10—15 *см*, прычым верх капца пакідаюць адчыненым да пачатку маразоў. Зямлю для накрыцця капцоў і траншэй трэба браць ад асновы на 1,5 метра, робіцца гэта для таго, каб забяспечыць капцы ад прамярзання зімой.

З надыходам маразоў робіцца поўнае ўкрыццё капцоў зямлёй з такім разлікам, каб агульная таўшчыня зямлі была 40 *см*. Пасля закладкі капцоў і траншэй за імі ўстанаўліваецца сталае нагляданне.

Вымярэнне тэмпературы—увосень да атрымання нармальнай тэмпературы праводзіцца штодзённа. Зімою не менш аднаго разу ў пяцідзёнку.

Пры адсутнасці ў гаспадарцы капцовых тэрмометраў, вымярэнне тэмпературы праводзіцца звычайным тэрмометрам, праз вертыкальныя трубы пастаўленыя ў капцы. Калі перад засыпкай бульбы, былі выкананы ўсе агратэхнічныя правілы загрузкі, то тэмпература ў капцы ці траншэі з надыходам халадоў пакрысе спадае да 2—3°C, а калі-ж тэмпература па меры зніжэння знадворнага паветра працягвае ў капцы заставацца высокай ці нават падымацца, трэба ўзмацніць вентыляцыю і знізіць тэмпературу да нармальнай. У тых выпадках, калі тэмпература працягвае заставацца высокай, то капец, ці траншэя зараз-жа ўскрываюцца і пры выяўленні гнілі—перабіраецца і ідзе ў рэалізацыю.

Зарэцкая.

РАБОТНІЦЫ, КАЛГАСНІЦЫ, ЖОНКІ РАБОЧЫХ, ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІЦЫ!

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА ЖУРНАЛ „Работніца і калгасніца Беларусі" ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ 2 РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

КОШТ ПАДПІСКІ:

1 месяц—20 кап., 3 м-цы—60 кап., 6 м-цаў—1 руб. 20 кап., 1 год—2 руб. 40 кап.

Падпіску здавайце на пошту альбо лістаносцам. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая 63, 3-ці паверх, пакой 11.

Кошт асобнага нумару 10 кап.

974

1964 г.

# Старонка кройкі і шыцця






## Тлумачэнне да выкрайкі

Блузку патрэбна шыць з паласатай бумазеі, дзякуючы гэтаму яна выглядае прыгожай і арыгінальнай. Блузка шыецца зусім проста, толькі трэба ведаць, як краіць паласаты матэрыял. Напрыклад спінку і перад, калі пападзецца матэрыял палосамі ўдоўж, то краіць яго патрэбна ўпоперак. Рукаў і каўнер патрэбна краіць коса, а какетку гарызантальна, калі матэрыял будзе ўдоўж палосамі. Манжэт кроіцца, як і спінка. Какетку трэба спераду прыстрачыць, а зад у выглядзе каўняра пакінуць не прышытым.

Як патрэбна карыстацца выкрайкай і як яе павялічыць. На выкрайцы ўказаны размеры ў сантыметрах у 10 разоў зменшанай велічыні. А калі патрэбна зрабіць выкрайку, бярэцца аркуш газетнай паперы, як паказана на малюнку пунктірам, напрыклад спінку: узяць аркуш паперы шырынёй 32 *см*, а даўжынёй—53, а потым адрэзаць патрэбную колькасць паперы ў залежнасці ад размера.

Выданне ЦК КП(б)Б

Ч. в. а. адказнага рэдактара Г. М. АЛЯКСЕЕВА

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1217. У ліку 8.725 экз. Уп. Галоўлітбела № А 5085.

Здана ў набор 20-IX—34 г. Падпісана да друку 26/IX—34 г. У нумары 2½ арк., 120.140 друк. знакаў.